ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 69 (2235)
30 жніўня 1968 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КАМІТЭЦЕ КП БЕЛАРУСІ

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА

Бюро ЦК КПБ абмеркавала пытанне аб падрыхтоўцы да стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна. У прынятай па гэтаму пытанню пастанове адзначаецца, што працоўныя Беларусі, як і ўвесь савецкі народ, з вялікім натхненнем і глыбокім адабрэннем сустрэлі пастанову ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна». У гэтым велізарнай важнасці тэарэтычным і палітычным дакументе партыі ярка і пераканаўча раскрыты веліч нашага правадыра і настаўніка, невычарпальная жыццёвая сіла яго вучэння, вызначана шырокая праграма ідэалагічнай і арганізатарскай работы.

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі абавязаў абкомы, гаркомы, райкомы партыі ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС распрацаваць разам з савецкімі органамі і грамадскімі арганізацыямі канкрэтныя планы падрыхтоўкі да надыходзячага юбілею па вобласці, гораду, раёну, па кожнаму прадпрыемству, калгасу, саўгасу, установе.

Намечаны асноўныя мерапрыемствы ЦК КП Беларусі ў сувязі з падрыхтоўкай да юбілею У. І. Леніна.

ЦК КП Беларусі даручыў рэдкалегіям газет і часопісаў, радыё і тэлебачання шырока і ўсебакова асвятляць ход падрыхтоўкі калектываў прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў і ўстаноў да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

У ІНТАРЭСАХ МІРУ І САЦЫЯЛІЗМА

КАМЮНІКЕ АБ САВЕЦКА-ЧЭХАСЛАВАЦКІХ ПЕРАГАВОРАХ

23—26 жніўня 1968 года ў Маскве адбыліся савецка-чэхаславацкія перагаворы, у якіх прымалі ўдзел:

з савецкага боку — Генеральны сакратар ЦК КПСС т. Л. І. Брэжнеў, Старшыня Савета Міністраў СССР, член Палітбюро ЦК КПСС т. А. М. Касыгін, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, член Палітбюро ЦК КПСС т. М. В. Падгорны, член Палітбюро ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў РСФСР т. Г. І. Воранаў, член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС т. А. П. Кірыленка, член Палітбюро ЦК КПСС, першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР т. Д. С. Палянскі, член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС т. М. А. Суслаў, член Палітбюро ЦК КПСС, старшыня ВЦСПС т. А. М. Шалепін, член Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Украіны т. П. Я. Шэлест, сакратар ЦК КПСС т. К. Ф. Катушаў, сакратар ЦК КПСС т. Б. М. Панамароў, міністр абароны СССР т. А. А. Грэчка, міністр замежных спраў СССР т. А. А. Грамыка;

з чэхаславацкага боку — Прэзідэнт ЧССР т. Л. Свобада, Першы сакратар ЦК КПЧ т. А. Дубчэк, Старшыня Нацыянальнага сходу ЧССР, член Прэзідыума ЦК КПЧ т. Й. Смркоўскі, Старшыня Урада ЧССР, член Прэзідыума ЦК КПЧ т. О. Чэрнік, член Прэзідыума ЦК КПЧ, Першы сакратар ЦК КПС т. В. Біляк, член Прэзідыума ЦК КПЧ, намеснік Старшыні Славацкага Нацыянальнага савета т. Ф. Барбірэк, член Прэзідыума ЦК КПЧ т. Я. Пілер, член Прэзідыума ЦК КПЧ т. Э. Рыго, член Прэзідыума ЦК КПЧ т. Й. Шпачэк, член Прэзідыума ЦК КПЧ т. О. Швестка, Старшыня Цэнтральнай кантрольна-рэвізійнай камісіі КПЧ т. М. Якеш, кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПЧ, сакратар ЦК КПЧ т. Й. Ленарт, кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПЧ т. Б. Шыман, намеснік Старшыні Урада ЧССР т. Г. Гусак, сакратар ЦК КПЧ т. А. Індра, сакратар ЦК КПЧ т. З. Млынарж, генерал-палкоўнік, міністр нацыянальнай абароны ЧССР т. М. Дзур, міністр юстыцыі ЧССР т. Б. Кучэра, пасол ЧССР у СССР т. В. Коуцкі.

У ходзе перагавораў былі ў адкрытай таварыскай дыскусіі абмеркаваны пытанні, звязаныя з сучасным развіццём міжнароднай абстаноўкі, актывізацыяй падкопаў імперыялізму супраць сацыялістычных краін, са становішчам у Чэхаславакіі ў апошні час і з часовым уступленнем на тэрыторыю ЧССР войск пяці сацыялістычных краін.

Бакі выказалі цвёрдае ўзаемнае перакананне ў тым, што ў цяперашняй абстаноўцы галоўнае заключаецца ў ажыццяўленні прынятых у Чыерне-над-Цісай сумесных рашэнняў і сфармуляваных Нарадай у Браціславе палажэнняў і прынцыпаў, а таксама ў паслядоўным ажыццяўленні практычных крокаў, якія вынікаюць з дасягнутай у ходзе перагавораў дагаворанасці.

Савецкі бок заявіў аб сваім разуменні і падтрымцы пазіцыі кіраўніцтва КПЧ і ЧССР, якое мае намер зыходзіць з рашэнняў, прынятых студзеньскім і майскім пленумамі ЦК КПЧ з мэтай удасканалення метадаў кіраўніцтва грамадствам, развіцця сацыялістычнай дэмакратыі і ўмацавання сацыялістычнага ладу на базе марксізма-ленінізма.

Была дасягнута дагаворанасць аб мерапрыемствах, мэтай якіх з'яўляецца хутчэйшая нармалізацыя становішча ў ЧССР. Чэхаславацкія кіраўнікі інфармавалі аб намечаных імі бліжэйшых мерапрыемствах, якія прымаюцца імі з гэтай мэтай.

З чэхаславацкага боку было заяўлена, што ўся работа партыйных і дзяржаўных органаў ва ўсіх лініях уздзеяння будзе накіравана на забеспячэнне дзейсных мерапрыемстваў, якія служаць сацыялістычнай уладзе, кіруючай ролі рабочага класа і камуністычнай партыі, інтарэсам развіцця і ўмацавання дружалюбных адносін з народамі Савецкага Саюза і ўсёй сацыялістычнай садружнасці.

Савецкія кіраўнікі, выражаючы аднадушнае імкненне народаў СССР да дружбы і брацтва з народамі сацыялістычнай Чэхаславакіі, пацвердзілі гатоўнасць да самага шырокага і шчырага супрацоўніцтва на асновах узаемнай павагі, раўнапраўя, тэрытарыяльнай цэласнасці, незалежнасці і сацыялістычнай салідарнасці.

Войскі саюзных краін, якія часова ўступілі на тэрыторыю Чэхаславакіі, не будуць умешвацца ва ўнутраныя справы Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Была дасягнута дагаворанасць аб умовах вываду гэтых войск з яе тэрыторыі па меры нармалізацыі абстаноўкі ў ЧССР.

Чэхаславацкі бок інфармаваў аб тым, што вярхоўны галоўнакамандуючы чэхаславацкімі ўзброенымі сіламі аддаў ім адпаведныя загады з мэтай недапушчэння інцыдэнтаў і канфліктаў, якія могуць выклікаць парушэнне спакою і грамадскага парадку. Ён даў таксама ўказанне ваеннаму камандаванню ЧССР знаходзіцца ў кантакце з камандаваннем саюзных войск.

У сувязі з абмеркаваннем у Савеце Бяспекі ААН так званага пытання аб становішчы ў Чэхаславакіі прадстаўнікі ЧССР заявілі аб тым, што чэхаславацкі бок не звяртаўся з просьбай аб пастаноўцы гэтага пытання на разгляд Савета Бяспекі і патрабуе яго знятця з парадку дня.

Кіраўнікі КПСС і кіраўнікі КПЧ пацвердзілі сваю рашучасць няўхільна праводзіць на міжнароднай арэне палітыку ў інтарэсах умацавання салідарнасці сацыялістычнай садружнасці, адстойвання справы міру і міжнароднай бяспекі.

Савецкі Саюз і Чэхаславакія, як і раней, будуць даваць рашучы адпор мілітарысцкім, рэваншысцкім і неанацысцкім сілам, якія імкнуцца перагледзець вынікі другой сусветнай вайны, парушыць недатыкальнасць існуючых у Еўропе граніц. Зноў пацверджана рашучасць няўхільна выконваць усе абавязацельствы, узятыя імі на сябе па шматбаковых і двухбаковых дагаворах, заключаных паміж сацыялістычнымі дзяржавамі, мацаваць абаронную магутнасць сацыялістычнай садружнасці, павышаць эфектыўнасць абарончага Варшаўскага Дагавору.

Перагаворы праходзілі ў абстаноўцы шчырасці, таварыскасці і дружбы.

ПЕРАМОЖА ДРУЖБА!

Вось ужо колькі дзён з неаслабнай увагай і трывогай сочаць савецкія людзі за падзеямі ў Чэхаславакіі. І гэта можна зразумець: нам не менш дарагія заваёвы сацыялізма ў Чэхаславакіі, як нашы ўласныя. І калі войскі пяці братніх краін працягнулі руку дапамогі працоўным ЧССР, мы ўсе ўздыхнулі з палёгкай: гэтыя заваёвы братняга народа будуць абаронены.

Але паведамленні, якія прыходзяць з Чэхаславакіі, сведчаць аб тым, што ворагі сацыялізма не складаюць сваёй зброі, вядуць падкопы, плятуць інтрыгі, часам ідуць на прамыя правакацыі. Вельмі крыўдна, што на чэхаславацкай зямлі зноў пралілася кроў савецкіх людзей. Мы кляймім ганьбай гэтых правакатараў, іх не міне суровая кара народа. Сваімі сэрцамі мы там, з нашымі байцамі, з усімі сумленнымі людзьмі Чэхаславакіі. Мы ўпэўнены, што дружба нашых народаў выйдзе з горна гэтых выпрабаванняў яшчэ больш умацаванай.

Мікалай ЧЫСЦЯКОЎ,
заслужаны дзеяч культуры БССР, мастацкі кіраўнік народнага ансамбля танца «Лявоніха» Палаца культуры Мінскага трактарнага завода.

У НАС — ЛЁС АДЗІН, АДЗІН ШЛЯХ

САВЕЦКІ народ звязваюць з народамі Чэхаславакіі доўгія гады шчырага брацтва і дружбы. Вось чаму тое, што адбываецца ў братняй краіне ў апошні час, выклікае натуральную заклапочанасць кожнага савецкага чалавека.

27 жніўня ў клубе Саюза пісьменнікаў БССР адбыўся агульны сход беларускіх літаратараў. Адкрываючы яго, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван Шамякін гаворыць аб тых падзеях, якія наспявалі і развіваліся ў Чэхаславакіі і за якімі з заклапочанасцю і трывогай сочыць увесь савецкі народ, у тым ліку і савецкія літаратары.

— Меры, прынятыя нашай краінай і іншымі сацыялістычнымі краінамі па аказанні дапамогі працоўным Чэхаславакіі, — гаворыць ён, — былі надзённымі і неадкладнымі. Спробам унутранай і знешняй рэакцыі падарваць у Чэхаславакіі сацыялістычны лад, адкалоць яе ад сям'і сацыялістычных краін народы гэтых краін супрацьпаставілі сілу класавай, пралетарскай салідарнасці і ўзаемадапамогі.

— Мы, беларускія пісьменнікі, — працягвае І. Шамякін, — горача падтрымліваем меры, якія прадпрымаюцца нашай партыяй і ўрадам і якія паслужаць умацаванню сацыялістычнага ладу ў Чэхаславакіі. Мы памагаем пабрацку, па-сяброўску нашым братам, на свабоду якіх замахваюцца ворагі сацыялізма, ворагі міру і міжнароднай бяспекі. Мы верым, што ў Чэхаславакіі знойдуцца сілы, якія дадуць рашучы адпор рэакцыі і контррэвалюцыі, не дазволяць ім саштурхнуць краіну са шляху будаўніцтва сацыялізма.

На трыбуне — намеснік галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва» пісьменнік Алесь Бажко.

— Я ведаю і люблю Чэхаславакію, люблю яе народы, іх літаратуру і культуру, — гаворыць ён. — І можа таму мне асабліва балюча чытаць і чуць пра тыя драматычныя, а падчас і трагічныя падзеі, што адбываліся ў гарадах гэтай братняй краіны. Але я веру, што пераважная большасць насельніцтва Чэхаславакіі, пераважная большасць чэхаславацкіх рабочых і сялян не верыць дэмагагічным лозунгам контррэвалюцыі.

— Нас, савецкіх пісьменнікаў, — гаворыць галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Павел Кавалёў, — асабліва абурае тая ганебная роля, якую адыгралі ў падзеях апошняга часу некаторыя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі Чэхаславакіі. Дзіўна, але ж факт, што асобныя літаратары паддаліся на правакацыі ворагаў сацыялізма, сталі прапаведнікамі і абаронцамі так званай «лібералізацыі» і «дэмакратызацыі», «чыстай дэмакратыі» і «свабоды для ўсіх». Ім давядзецца адказваць перад народам за свае чорныя справы і ўчынкі. Ганьба літаратарам, якія служаць не народу, а цёмным сілам рэакцыі.

— Мне давялося быць у Чэхаславакіі ў той час, калі яна адзначала першую гадавіну вызвалення ад гітлераўскага фашызму, — гаворыць народны пісьменнік Беларусі Кандрат Крапіва. — Памятаю Прагу ў той дзень, калі яна літаральна ўся выйшла на вуліцы. Гэта была велічная маніфестацыя вялікай любві і павагі чэхаў і славакаў да савецкага народа, да савецкай краіны, да нашай Савецкай Арміі, якая прынесла вызваленне ад карычневай чумы народам Еўропы, у тым ліку і народам Чэхаславакіі. Хочацца верыць, што агонь гэтай дружбы і любві не згасне, што народы братняй краіны будуць ісці поплеч з намі.

Неаднойчы бываў у Чэхаславакіі Пілып Пестрак. Дзелячыся на сходзе сваімі ўспамінамі і ўражаннямі ад наведвання братняй краіны, старэйшы камуніст пісьменніцкай арганізацыі з агідай гаворыць пра чэхаславацкіх «інтэлектуалаў», пра «адшліфаваных абывацеляў», якія сталі галоўнай апорай унутранай контррэвалюцыі, з тупой мяшчанскай злосцю аплёўваючы ўсё тое, чаго дасягнулі працоўныя за дваццаць гадоў сацыялістычнага будаўніцтва.

Горача падтрымаў меры нашай партыі і ўрада па ўмацаванні сацыялістычнага ладу ў Чэхаславакіі, якому пагражаюць контррэвалюцыйныя сілы, што падбухторваюцца і падтрымліваюцца імперыялістычнай рэакцыяй, генерал у адстаўцы пісьменнік Мікалай Аляксееў.

— Дапамога брацкіх сацыялістычных краін, аказаная народу Чэхаславакіі, пахавала надзеі імперыялістычных колаў Захаду і ўнутранай контррэвалюцыі на ажыццяўленне жахлівых задум, якія яны даўно выношвалі, — гаворыць сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Іван Мележ. — Здзіўляцца злоснаму выццю ў іх стане не даводзіцца. Гэтая воўчая зграя рабіла ўсё, каб раздуць у Чэхаславакіі пажар і ў полымі гэтага пажару пахаваць заваёвы сацыялізма. Іх выццё, аднак, бяссільнае. Савецкі народ, народы другіх сацыялістычных краін працягнулі чэхаславацкаму народу руку братняй дапамогі. Нікому і ніколі не будзе дазволена вырваць ніводнага звяна з магутнай сацыялістычнай садружнасці, — гаворыць наша партыя. Гэта голас усяго нашага народа.

На сходзе была аднадушна прынята рэзалюцыя, у якой гаворыцца:

— Мы, пісьменнікі Беларусі, сардэчна і аднадушна ўхваляем рашэнне Савецкага ўрада і ўрадаў саюзных сацыялістычных краін аб аказанні неабходнай дапамогі братнім народам Чэхаславакіі ў іх барацьбе з контррэвалюцыяй.

Гэтае рашэнне выходзіць з прынцыпаў пралетарскага інтэрнацыяналізму, даўняй і непарушнай дружбы і супрацоўніцтва нашых народаў, цалкам адпавядае прынцыпам Варшаўскага Дагавору і з'яўляецца вельмі сучаснай і неабходнай мерай.

Заваёвы сацыялізма ў Чэхаславакіі — гэта заваёвы і нашага народа, які велізарнай цаной, велізарнымі ахвярамі разграміў фашызм у гады Вялікай Айчыннай вайны. Мы кляймім ганьбаю тых адшчапенцаў, якія, забыўшыся на ўсё добрае, што звязвала і звязвае працоўных нашых краін, зараз брудна паклёпнічаюць, аблываюць грязззю сумленных сыноў і дачок Чэхаславакіі, яе партыю, яе народ.

Мы былі і будзем разам з вамі, сумленныя працаўнікі Чэхаславакіі. Справа міру, справа сацыялізма, наша сацыялістычная садружнасць выпрабавана ў вялікіх бойках з ворагамі працоўных, яна непарушна назаўжды, яна была і ёсць тая светлая крыніца, якую мы нікому і ніколі не дазволім забрудзіць.

Усе свае сілы мы, беларускія літаратары, аддаём служэнню справе камуністычнай партыі, савецкаму народу. Мы будзем і далей змагацца непахісна за тое, каб заўжды святкавалі перамогу ідэі марксізма-ленінізма, каб заўсёды свяціла людзям сонца мірнай шчаслівай працы.

У зале агульнага сходу беларускіх пісьменнікаў. Фота Ул. КРУКА.

НЕ ВЫЙШЛА І НЕ ВЫЙДЗЕ!

Гнеўна асудзілі падкопы міжнароднага імперыялізму і контррэвалюцыі ў Чэхаславакіі беларускія мастакі, якія з гэтага поваду сабраліся 27 жніўня на мітынг.

Старшыня прэзідыума праўлення Саюза мастакоў В. Грамыка, адкрываючы мітынг, падкрэсліў, што савецкія людзі ды і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва не маглі раўнадушна назіраць за падзеямі, што ўспыхнулі ў сацыялістычнай Чэхаславакіі, бо стваралася пагроза ўсяму сацыялістычнаму лагеру. Рашэнне ўрадаў сацыялістычных краін неадкладна памагчы чэхаславацкаму народу было правільным і своечасовым.

— Нашы воіны, якія знаходзяцца ў Чэхаславакіі, выконваюць высакародную місію, — сказаў сакратар партыйнай арганізацыі Саюза мастакоў БССР А. Казлоўскі. — Неабходна даць сакрушальны адпор заўзятым ворагам сацыялізма. Мы даўно былі ўстрывожаны сімптомамі ненармальнага становішча ў братняй краіне, дзе радыё, друк, тэлебачанне апынуліся ў руках антысацыялістычных сіл, дзе з многіх кіруючых пастоў былі зняты сапраўдныя марксісты. Мы не маглі не прыйсці на дапамогу нашым братам.

— Мы перакананы, — працягвае А. Казлоўскі, — што контррэвалюцыя не пройдзе. Чэхаславацкі народ дасць рашучы адпор рэакцыянерам, і становішча ў Чэхаславакіі будзе нармалізавана. Зарука гэтаму — аднадушная падтрымка барацьбы прагрэсіўных сіл Чэхаславакіі з боку савецкага народа і народаў іншых сацыялістычных краін.

Слова бярэ адзін са старэйшых беларускіх мастакоў Л. Лейтман. Ён гаворыць, што дапамога братняму чэхаславацкаму народу — яшчэ адно сведчанне таго, што лагер сацыялізма недатыкальны, што ніякія падкопы імперыялістаў не здолеюць вырваць ні аднаго звяна з гэтага магутнага лагера.

Скульптар У. Слінчанка, удзельнік вызвалення Прагі ў незабыўным 1945 годзе, расказаў аб тым, з якой удзячнасцю сустракалі пражане сваіх вызваліцеляў.

— Тое, што адбываецца ў Чэхаславакіі ў гэтыя дні, — гаворыць У. Слінчанка, — вельмі трывожыць кожнага, каму дарагія мір і спакой на зямлі, каму дарагія братнія ўзаемаадносіны паміж краінамі сацыялістычнай садружнасці. Удзельнік вызвалення Чэхаславакіі ад фашыстаў, я разам з усімі савецкімі людзьмі шчыра ўхваляю рашэнні нашай партыі і нашага ўрада, якія адвялі варварскую руку контррэвалюцыі ад заваёў чэхаславацкага народа.

— Нельга не пакланіцца нашым слаўным танкістам, якія прынялі смерць, але не далі танку наехаць на дзяцей, падстаўленых правакатарамі на дарозе, — гаворыць старэйшы беларускі мастак А. Марыкс. — Гэта сапраўдны гераізм. Савецкі народ гатовы плаціць самай дарагой цаной, каб на зямлі панавалі мір і спакой. Мы спадзяёмся, што ўсе сумленныя людзі ў Чэхаславакіі зразумеюць, з якой высакароднай мэтай прыйшлі ў іх краіну воіны братніх сацыялістычных дзяржаў. Трэба, каб чэхаславацкі народ, якога ворагі імкнуцца дэзарыентаваць, ведаў усю праўду аб тых, хто хацеў звергнуць сацыялістычны лад у рэспубліцы.

— Я хачу далучыць свой голас да магутнага голасу нашай грамадскасці ў падтрымку дзеянняў Савецкага ўрада і ўрадаў іншых краін — удзельніц Варшаўскага Дагавору, якія прыйшлі на дапамогу Чэхаславакіі, — гаворыць народны мастак БССР А. Бембель. — Краіны сацыялістычнай садружнасці пайшлі на акцыю, якая прадухіліла контррэвалюцыйны пераварот у братняй нам краіне.

Сусветны імперыялізм самкнуўся з контррэвалюцыяй у самой Чэхаславакіі, — працягвае А. Бембель. — Але чарговая спроба падарваць нашу баявую, нашу братэрскую садружнасць правалілася. Інакш і не магло быць. Зусім натуральна, што лепшыя сілы кампартыі Чэхаславакіі своечасова звярнуліся за дапамогай да сваіх братоў па класе. Зусім натуральна, што такая дапамога неадкладна была аказана. І мы вітаем воінаў нашай арміі, якія выконваюць свой высакародны абавязак. І мы жадаем нашым чэхаславацкім братам дабра.

Удзельнікі мітынгу адзінадушна прынялі рэзалюцыю.

— Мы, беларускія мастакі, абураныя выступленнем контррэвалюцыйных сіл у Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспубліцы, — гаворыцца ў ёй, — аднадушна ўхваляем рашучыя дзеянні Савецкага ўрада і ўрадаў іншых сацыялістычных краін, накіраваныя на абарону сацыялістычных заваёў Чэхаславакіі.

Падкопы антысацыялістычных сіл асуджаны на правал. Адзінства і згуртаванасць братніх народаў сацыялістычнай садружнасці перамогуць.

Чэхаславакія застанецца сацыялістычнай.

БЕЛАРУСКІЯ МАСТАКІ — ЛЕНІНСКАМУ КАМСАМОЛУ

ЛЕНІНСКІ камсамол... Надзейны памочнік Камуністычнай партыі ў ратных подзвігах і ў мірнай, стваральнай працы... Яго жыццё — невычарпальная крыніца натхнення майстроў беларускага выяўленчага мастацтва. Слаўнаму 50-годдзю ВЛКСМ — саюза маладых будаўнікоў камунізма прысвечана рэспубліканская мастацкая выстаўка, якая адкрылася 28 жніўня ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР.

Беларускія жывапісцы і скульптары, майстры станковай і кніжнай графікі — і сталыя ўжо майстры, і зусім маладыя, якія толькі пачынаюць творчы шлях, — паказваюць у сваіх творах паўвекавы гераічны шлях камсамола: яго ўдзел у грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнах, у мірным будаўніцтве ў гады першых пяцігодак і ў нашыя дні.

Экспануюцца творы, ужо добра знаёмыя гледачу, такія, як, напрыклад, «Па сваёй зямлі» У. Мінейкі, «Этапы вялікага шляху» Б. Аракчэева, «Беларусь. За ўладу Саветаў» Н. Воранава, трыпціх «Міхаіл Васільевіч Фрунзе» Л. Асядоўскага, «Абаронцы Брэсцкай крэпасці» і «Юны партызан» Я. Зайцава, «Нарачанская быль» І. Давідовіча і інш., а таксама новыя, створаныя да гэтай выстаўкі: «Са школы на будоўлі» В. Гроса, «Медсястра» В. Бароўскага, «Юнацтва» Л. Асядоўскага, «Дзяўчына са сланечнікам» Н. Шчаснай, «Свінарка» Р. Міхеевай, «Лён» В. Байцуна. «Я ў Прыбалтыцы» Л. Дударэнкі, «Чырвонае кафэ» і «Партрэт дачкі» Л. Шчэмелева, шматлікія акварэлі, гравюры, кніжная графіка.

Экспазіцыя ўвачавідкі пераконвае, што беларускія мастакі здолелі паказаць многія істотныя рысы характару нашага маладога сучасніка, вытокі гэтага характару ў мінулым — у подзвігах бацькоў і дзядоў. Пра гэта сведчаць і вялікая кампазіцыя сёлетняга выпускніка Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута А. Валатовіча «Провады ў армію», і графічныя работы А. Паслядовіч «Мужнасць», «Партызанская сям'я», і новая карціна Р. Кудрэвіч, прысвечаная камсамольцам, якія праязджаюць у цяплушцы на фронт міма родных мясцін, і цэнтральная частка вядомага трыпціха М. Данцыга «На варце міру» і шмат якія іншыя творы.

На выстаўцы шмат новых пейзажаў. Сярод іх — створаныя сёлета В. Цвірко «Цёплы дзень патухаў», «Жаўранак пяе», «Нарач».

Такія работы, як «2000-ы год» І. Міско, «Мінск зімой» Ул. Пасюкевіча, «Беларуска» Л. Налбайкі, «Двое» Г. Вашчанкі, новыя акварэлі Ф. Гумена, прысвечаныя Віцебску, а таксама многія прыгаданыя раней творы, пераконваюць у сапраўдным багацці творчых індывідуальнасцей мастакоў, якія прымаюць удзел у выстаўцы, у іх жаданні адшукаць новыя выразэнні той ці іншай тэмы.

Жыццё камсамола, вобразы нашых маладых сучаснікаў валодаюць душою беларускіх мастакоў усіх пакаленняў. Яшчэ не аднойчы яны паслужаць крыніцай натхнення для многіх майстроў пэндзля і разца.

VI МІЖНАРОДНЫ З'ЕЗД СЛАВІСТАЎ

Кожныя пяць гадоў славісты свету збіраюцца разам, каб падвесці вынікі сваёй работы, абмеркаваць надзённыя праблемы славістыкі, вызначыць асноўныя кірункі далейшай працы. Апошні, VI Міжнародны з'езд славістаў працаваў у Празе з 7 па 13 жніўня гэтага года. У рабоце з'езда прыняло ўдзел звыш паўтары тысячы вучоных з 26 краін свету: Савецкага Саюза, Чэхаславакіі, Польшчы, Балгарыі, Венгрыі, Югаславіі, ГДР, Францыі, Англіі, ЗША, Канады і інш. Яны зрабілі больш 500 дакладаў і паведамленняў па розных праблемах славянскага мовазнаўства, літаратуразнаўства і фальклярыстыкі, па літаратурна-лінгвістычных і агульнаславістычных гістарычных праблемах.

На з'ездзе працавала пяць секцый і некалькі падсекцый, а таксама чатырнаццаць камісій. Найбольш прадстаўнічай была мовазнаўчая секцыя, на пасяджэннях якой абмяркоўваліся праблемы фаналагічнай і марфалагічнай структуры слова ў славянскіх мовах, тыпы пабудовы сказаў і іх гістарычнае развіццё, пытанні стандартызацыі славянскіх літаратурных моў, задачы і перспектывы развіцця дыялекталагічных даследаванняў, праблемы параўнальна-гістарычнага і тыпалагічнага аналізу славянскай лексікі, праблемы моўных кантактаў паміж славянскімі, а таксама паміж славянскімі і неславянскімі мовамі і інш. З вялікай увагай удзельнікі з'езда слухалі даклады савецкіх славістаў-мовазнаўцаў В. Вінаградава, Р. Аванесава, Ц. Ламцёва, М. Талстога і інш.

Славісты - літаратуразнаўцы абмяркоўвалі асноўныя метадалагічныя і гістарычныя праблемы параўнальнага славянскага літаратуразнаўства, у прыватнасці, пытанне аб месцы славянскіх літаратур у літаратуры свету, пытанні параўнальнай гісторыі славянскіх літаратур і міжславянскіх сувязей, метады, прынцыпы і напрамкі развіцця славянскіх літаратур XX стагоддзя, агульнасць і адрозненні ў развіцці старажытных славянскіх літаратур. На секцыі літаратуразнаўства з дакладамі выступалі савецкія вучоныя Д. Маркаў, П. Беркаў, А. Бушмін, Д. Благой, Д. Ліхачоў і іншыя.

Літаратурна - лінгвістычная секцыя абмяркоўвала пытанні перакладу са славянскіх моў і на славянскія мовы, стылістычнай структуры мастацкіх твораў у гістарычным і тыпалагічным планах, праблемы стылістыкі мовы мастацкай літаратуры славян.

На пасяджэннях секцыі народнай вусна-паэтычнай творчасці ў цэнтры ўвагі былі такія праблемы, як славянская народная балада, жанравая сістэма славянскай народнай літаратуры, яе класіфікацыя і каталагізацыя, а таксама пытанні паўнароднай літаратуры (лубок, кіржамашовыя песні, народныя кніжкі і г. д.), параўнальнага вывучэння славянскай народнай эпікі.

Нарэшце, на секцыі агульнай славістыкі прадметам дыскусій і абмеркаванняў былі гісторыя славістыкі, развіццё ідэй славянскай узаемнасці ў XVIII — XX стагоддзях, адзінства славянскіх народаў у гады другой сусветнай вайны, іх сацыяльнае і культурнае развіццё ў пасляваенныя гады.

Вельмі цяжка хаця б коратка расказаць аб рабоце кожнай секцыі з'езда славістаў — дакладаў і выступленняў, як я гаварыў ужо, было шмат. Хочацца толькі адзначыць, што праблематыка і тэарэтычны ўзровень дакладаў савецкіх славістаў сведчаць аб тым, што наша савецкая славістыка займае перадавыя пазіцыі ў сусветнай навуцы аб славянскіх народах. Як на прыклад, спашлюся на работу нашай секцыі — секцыі вусна-паэтычнай народнай творчасці. Даклады савецкіх фалькларыстаў В. Гусева, Б. Пуцілава, В. Сакаловай, К. Чыстова, А. Дэя і іншых, а таксама выступленні савецкіх дэлегатаў у спрэчках у значнай ступені вызначылі агульны высокі тэарэтычны ўзровень навуковай дыскусіі.

Прызнаннем вялікіх поспехаў савецкіх вучоных з'явілася прысуджэнне вядомаму савецкаму даследчыку В. Жырмунскаму звання ганаровага доктара Пражскага універсітэта, а таксама ўручэнне групе савецкіх вучоных залатых і сярэбраных медаляў Чэхаславацкай Акадэміі навук і Карлава універсітэта.

У рабоце Міжнародных з'ездаў славістаў пастаянны ўдзел прымаюць беларускія вучоныя, дзейнасць якіх каардынуе Беларускі камітэт славістаў, які ўзначальвае дырэктар Інстытута мовазнаўства АН БССР М. Суднік. На VI з'езд славістаў было прапанавана больш дваццаці дакладаў і паведамленняў беларускіх знаўцаў славістыкі. Аднак у сувязі з жорсткімі абмежаваннямі колькасці дакладаў Міжнародны камітэт уключыў у парадак дня толькі пяць з іх, а непасрэдна на з'ездзе былі зачытаны тры даклады: «Літоўскія элементы ў беларускай анамастыцы» М. Бірылы, «Энкліза і пракліза ў структуры славянскага сказа» Г. Цыхуна і «Беларуская казка ў казачным эпасе славян» аўтара гэтых радкоў. Акрамя гэтага, быў апублікаваны даклад В. Зайцава «Багамільскі рух і грамадскае жыццё паўночнай Італіі эпохі Дучэнта».

Да наступнага, VII Міжнароднага з'езда славістаў, які адбудзецца ў Варшаве, пяць гадоў. Гэты час беларускія славісты павінны выкарыстаць для далейшай распрацоўкі надзённых праблем славістыкі.

К. КАБАШНІКАЎ,
кандыдат філалагічных навук.

НА ЭКРАНЕ — МАЛАДОСЦЬ АЙЧЫНЫ

Многія самадзейныя кінастудыі і аматары напярэдадні паўвекавога юбілею ВЛКСМ ствараюць гістарычныя кінаэтапісы і кінанарысы, прысвечаныя камсамольскім арганізацыям. Яны здымаюць фільмы, кінарэпартажы аб баявых і працоўных буднях савецкай моладзі.

Сакратарыят ЦК ВЛКСМ, сакратарыят ВЦСПС, калегія Міністэрства культуры СССР і сакратарыят Саюза кінематаграфістаў СССР вырашылі падтрымаць гэтае пачынанне. Яны прынялі пастанову правесці Усесаюзны кінафестываль аматарскіх фільмаў, прысвечаны 50-годдзю ВЛКСМ. Фестываль будзе праходзіць з 25 верасня па 1 кастрычніка сёлетняга года ў Жытоміры Украінскай ССР. Яго дэвіз: «На экране — маладосць Айчыны».

Галоўная мэта фестывалю — садзейнічаць далейшаму развіццю і павышэнню мастацкага майстэрства кінааматараў; ён павінен прыцягнуць самадзейныя кінастудыі, кінаклубы да актыўнага ўзнаўлення гераічнай гісторыі Ленінскага камсамола, да стварэння высокамастацкіх праўдзівых фільмаў пра нашага маладога сучасніка. Для заахвочвання пераможцаў конкурснага паказу ўстанаўліваюцца прызы, прэміі, дыпломы.

Старшынёй аргкамітэта фестывалю зацверджан сакратар ЦК ВЛКСМ А. І. Камшалаў, старшынёй журы — народны артыст СССР, кінарэжысёр Р. Л. Рашаль.

Кар. ТАСС.

А ці абавязкова — з рыпам?

ЕХАЎ я сюды не ў добрым настроі. Што і казаць — прашляпіў. Гомельскія тэлевізійшчыкі — тыя ў момант паспелі. Такую перадачу адгрукалі, што не адарвешся. Мазырскі нафтаперапрацоўчы! Другі ў рэспубліцы... Бы на парадзе, выстраіліся магутныя скрэперы, за імі — бульдозеры, побач, бы жырафы, краны, далей — самазвалы. Ля іх мужныя, вясёлыя і бадзёрыя першапраходцы. Сярод векавога лесу яны будуюць прамысловы гігант. Здорава!

Знаеце, пра што спыталі рабочыя, калі даведаліся, што я з газеты? Як з маленькай сасны зрабіць вялікую? Я важна сказаў, што прыехаў да іх не загадкі адгадваць, а каб напісаць пра нашых самаадданых будаўнікоў нарыс...

— Ды вы не крыўдуйце, — сказаў невысокі чарнявы хлопец у камбінезоне. — Паглядзіце на гэты сасоннік... Колькі, па-вашаму, яму гадоў?

— М-м... Відаць, пасляваенны...

— Правільна. А па тэлевізары яго паказалі так, што кожнае дрэва ўпіраецца ў хмары... Вось мы і гаварылі паміж сабой — каму патрэбна такая хлусня... Хапіла нам і з такім лесам, што ёсць. Пачыналі валіць яшчэ зімой, на пояс у снезе. Ды з ручнымі піламі...

Я падумаў, што вось прыехалі таварышы з тэлебачання сюды з самымі шчырымі намерамі, відаць, з усіх сіл стараліся, каб лепш паказаць будоўлю, яе людзей, а вынік бач які — пакрыўдзіліся людзі. А ўсё, відаць, з-за таго, што шукалі непатрэбнага эфекту.

— А ты скажы яшчэ карэспандэнту, — падказвае нехта, — што назаўтра ж, як паехалі тэлевізійшчыкі, амаль усю тэхніку ад нас забралі...

— І добра, што забралі, — устаўляе трэці, — нашто яна тут? Мы, бачыш, і з рыдлёўкамі без работы сядзім.

Я слухаю іх і раптам не ведаю, па якой ужо асацыяцыі, успамінаю радкі з «Дванаццаці крэслаў» Ільфа і Пятрова аб будаўніцтве старгародскага трамвая, а дакладней, пра тое, як асвятлялася яно ў мясцовай газеце. Памятаеце? «...Падымаюся па кроквах. Вецер шуміць у вышшу. Наверсе — ён, гэты будаўнік нашай магутнай трамвайнай станцыі... Успамінаю: «На беразе пустынных вод стаяў ён, буйных дум палёт лунаў удаль»... Цікаўлюся: як выконваецца заданне? ...Ён паціскае мне руку. Ён гаворыць:

— Семдзесят працэнтаў задання ўжо выканана.

...Рабочыя завіхаюцца там і сям. Хто можа забыць гэтага кіпення рабочай будоўлі?..»

Забягаючы наперад скажу, што назаўтра пасля майго ад'езду з будоўлі сюды зноў наскочыла цэлая тэлерадыёгазетная брыгада, — фатаграфавалі, бралі інтэрв'ю, запісвалі на плёнку.

Не ведаю, як перанёс гэта прараб Мікалай Сямёнавіч Харлан, толькі на мяне ён зрабіў уражанне чалавека бясконца стомленага і разгубленага.

— Не разумею, што тут робіцца, аніяк не разумею, — паўтараў ён глухаватым голасам. — А я ж не навічок. Некалькі гадоў будаваў у Казахстане... І вось прыехаў сюды... Як на востраў... Нават тэлефоннай сувязі з горадам няма... Э, ды што там тэлефон. Працаваць нельга. Павінны штодзень атрымліваць дзесяць тысяч штук цэглы — завозяць тысячу. Цэменту, друзу — каліва. Адным словам, гарым. Вось і бягуць адсюль рабочыя. Учора толькі тры бетоншчыцы звольніліся. А прыехалі ж здалёк, аж з Казахстана. Прачыталі ў газеце, што будаўніцтва вялікага завода, узялі і прыехалі...

— Але ж заводскія карпусы растуць, — кажу я.

— Заводскія? — здзіўляецца прараб. — Ды тут заводам яшчэ і не пахне... І я ж усім тлумачу, што мы толькі рыхтуем базу для будучага завода. Склады, асфальтабетонны завод, заводы зборнага жалезабетону, буйнапанельных дамоў і г. д. Калі ўсё гэта будзе гатова, тады і завод пачне будавацца... Няўжо не зразумела?

Каб больш не вяртацца да гэтай нікому не патрэбнай шуміхі вакол будоўлі, перакажу сваю гутарку з выконваючым абавязкі дырэктара будучага нафтаперапрацоўчага завода Генадзем Мікалаевічам Крыўко.

— Ведаеце, мне ўжо і з Мінска і з Масквы званілі, пытаюцца, што тут у нас робіцца? Кажуць, яшчэ капейкі на завод не адпушчана, а мы ўжо будуем яго.

— Але ж дырэкцыя ёсць...

— Дырэктар, — папраўляе Генадзь Мікалаевіч, — ну і яшчэ бухгалтар і машыністка... Больш нікога. І займаемся мы пакуль што толькі дакументацыяй будучага завода.

...З кім бы з зацікаўленых асоб я ні гаварыў — з кіруючымі работнікамі міністэрства прамысловага будаўніцтва, з кіраўнікамі будаўнічага трэста № 20 у Светлагорску — генеральным падрадчыкам, з мазырскімі партыйнымі работнікамі, усе аднадушна згаджаліся: становішча на будаўніцтве — горш не бывае.

Ну, што ж, рэальны падыход да справы ўжо што-небудзь ды значыць. Адно толькі мяне ўразіла — той-сёй імкнуўся давесці, што гэта натуральны ход падзей, маўляў, амаль кожная будоўля, асабліва вялікая, пачынаецца з рыпам.

Я далёкі ад думкі, што ў такой складанай справе, як будаўніцтва, можна ўсё прадугледзець. Бываюць аб'ектыўныя прычыны, якія тармозяць справу, негледзячы на ўсе старанні людзей.

Але тут усё куды прасцей. Я паспрабаваў прааналізаваць некаторыя прычыны зрываў на будоўлі. Ну і што ж? Аказваецца, проста хтосьці з кімсьці дрэнна дамовіўся, спазніўся з заяўкай, з пераводам грошай і г. д.

Сам генеральны падрадчык (гучыць як!) трэст № 20 і яго 131-е будаўнічае ўпраўленне знаходзяцца ў Светлагорску. Там у іх асноўныя аб'екты, туды яны перш за ўсё шлюць будаўнічыя матэрыялы, а ў Мазыр — што застанецца. Чатыры месяцы з трэста сюды амаль ніхто не наведваўся.

Загадчык прамыслова-транспартнага аддзела Мазырскага гаркома КПБ Уладзімір Паўлавіч Рапятуха расказвае:

— Прыбег неяк у гарком прараб. Мазырская аўтакалона, што іх абслугоўвае (адзін з субпадрадчыкаў) забрала, кажа, усе машыны. Званю дырэктару калоны, лаюся. А ён мне — забраў, кажа транспарт, бо трэст вінен ім шэсць тысяч рублёў... Званю ў трэст — чаму не пералілі грошы? Ах, аказваецца, нехта некаму даручыў гэта зрабіць, а той забыўся ці не зразумеў. У выніку жыццё на будоўлі на некалькі дзён, пакуль усё не высветлілася, спынілася...

Факт гэты можа каму здасца дробязным. Падумаеш, нейкіх 6 тысяч рублёў, калі лік ідзе на мільёны. Не, таварышы, не прасты, не бяскрыўдны гэты фактык. Па ім можна ўявіць сабе дзелавую культуру.

І яшчэ адно... Мы неяк прызвычаіліся ўлічваць перш за ўсё тое, што можна вызначыць у матэрыяльных адзінках. Я бачыў заклапочанасць міністэрскага начальства тым, што графік будаўніцтва ля Мазыра зрываецца. Так, у зводцы гэта вельмі ясна паказана. Не паказана іншае, а менавіта маральныя страты. О, яны не менш адчувальныя, чым матэрыяльныя.

Мы любім, бывае, пагаварыць пра выхаванне ў рабочага гонару за працу, за калектыў, у якім ён працуе. На міхалкаўскай будоўлі (яна так называецца, бо паблізу стаіць вёска Міхалкі), я бяру на сябе смеласць сказаць, робіцца ўсё (няхай і не спецыяльна), каб дабіцца якраз процілеглых вынікаў.

Адзін з кіруючых таварышаў сказаў мне:

— Вы хочаце, каб было зусім без цяжкасцей? Так не бывае...

Сапраўды, так не бывае. Але ж і прырода цяжкасцей розная.

Я неяк чытаў у часопісе «Агонёк» нарыс пра разведчыкаў нафты, якія працуюць у Каракумах, дзе толькі пясок ды вецер, дзе на сотні кіламетраў няма ні дрэўца, ні жылля. Я разумею, як гэта цяжка. Але людзі працуюць, людзі ідуць на подзвіг, бо ведаюць, што інакш нельга, што трэба перамагчы пустыню.

Крыўдна, калі даводзіцца пераадольваць цяжкасці, якіх магло і не быць, якія папросту, калі можна так сказаць, «справа рук чалавечых».

І вось, калі людзі пачынаюць гэтым абурацца, таму-сяму гэта прыходзіцца не да спадобы.

Успамінаю, як аднойчы мне скардзіўся старшыня калгаса:

— Разумееце, разбэсціліся людзі — і то ім не так, і тое не гэтак... А я вось жыў у вайну ў Ленінградзе, дык, ведаеце, як там народ працаваў? Па дзве-тры змены запар, ды на галодным пайку. І нічога — не скардзіліся...

Мэта такіх разважанняў заўсёды адна — схаваць сваю абыякавасць, сваё нежаданне ці няўменне арганізаваць справу.

Вось і тут... Я не скажу, што на міхалкаўскай будоўлі, дзе пакуль што толькі дзвесце чалавек, трэба адразу, скажам, пабудаваць кафэ, палац культуры і г. д. Але ж, скажам, недзе карміць рабочых усё-такі трэба?

Зайшоў я на будоўлі ў буфет, што туліцца ў маленькім пакойчыку каля прарабскай. На паліцах — некалькі бутэлек ліманаду ды цыгарэты (дарэчы, самыя дарагія). Ні хлеба, ні каўбасы, ні селядца, ні нават кансерваў...

— Вымушаны браць харчы з дому, — скардзяцца рабочыя. На работу яны прыязджаюць з Мазыра, з Ельска, з навакольных вёсак, дзе ўладкаваліся на прыватных кватэрах.

Я паспрабаваў разблытаць гэты клубок і, далібог, так канцоў і не знайшоў. Самае дзіўнае, што няма, разумееце, вінаватых. З кім я ні гаварыў, — кожны стаіць на вышыні сучасных задач, кожны разумее абстаноўку і гарыць жаданнем дапамагчы выправіць становішча, але... але, вось каб яшчэ Іваноў не перашкаджаў, дык было б усё ў парадку...

У Міхалках — цэнтры саўгаса «Мазырскі» — за два кіламетры ад будоўлі ёсць сталовая.

— Чаму не прывозіць абеды алтуль? — цікаўлюся ў буфетчыцы.

— Я то вазіла б, але санітарны інспектар не дазваляе, — трэба, кажа, каб на будаўнічай пляцоўцы пабудавалі хоць якую павець. А пад адкрытым небам нельга — пясок, гразь...

Пытаюся ў прараба, чаму не пабудавалі тую павець.

— Трэст супраць, бо па плану ў нас павінна быць стацыянарная сталоўка.

Вось так, трэст супраць і ўсё. Заходжу з другога боку. Паехаў да старшыні праўлення Мазырскага раённага спажывецкага таварыства Ягора Уласавіча Ігнаценкі. Міхалкі — яго «епархія».

— Што? Рабочы не забяспечаны прадуктамі? Ай-яй... Зараз паклічам інспектара, што адказвае за той куст.

Уваходзіць інспектар.

— Ты быў на будоўлі?

— Не, не быў.

— Чаму не быў?

— Таму што ў іншым месцы быў.

— Але ж я казаў, каб ты і тут быў.

Прыблізна паўгадзіны ідзе высвятленне, чаму «не быў».

— Вось карэспандэнт скардзіцца (гэта я скарджуся!), што міхалкаўскіх будаўнікоў дрэнна забяспечваюць таварамі. Гэта праўда?

— Можа і праўда. Я ж не быў.

— Дык можа туды аўталаўкі пасляць?

— Так, можна і пасляць...

— Дык няўжо ж трэба было чакаць прыезду карэспандэнта, каб пасляць гэтыя лаўкі? — не вытрымліваю я.

— Не падумалі, — кажа Ягор Уласавіч, — а наогул будоўлю гэтую нам выпадкова далі. Яе мазырскі гархарчгандаль павінен абслугоўваць, у яго магчымасцей больш. Можа, будзеце ў сакратара гаркома, калі ласка, скажыце яму пра гэта. А калі не захоча, дык папрасіце для нас аўтамашыну, не хапае ў нас аўтатранспарту...

Быў я і ў сакратара гаркома КПБ Аляксандра Гаўрылавіча Карчэўскага.

— Так, так, можа сапраўды іх перадаць гархарчгандлю, — згадзіўся ён. — Але, ведаеце, і міністэрства будаўніцтва падводзіць... Вось на гэтым самым крэсле, — паказвае рукой, — сядзеў у мяне намеснік галоўнага інжынера Белхімбуда Бязручкін. Калаціў сябе ў грудзі, абяцаў, што на будоўлі, вось павінны прабіць шчыліну, бо колькі ж можна без вады (я забыўся сказаць — ваду рабочым возяць з суседніх вёсак), пабудуюць сталоўку і г. д... Але паехаў і, як кажуць, след прастыў...

Прыехаўшы ў Мінск, я адразу ж пабег у Белхімбуд. Бязручкіна не знайшоў, але натрапіў на намесніка начальніка камбіната Анатоля Іванавіча Кавалеўскага.

— Усё, усё ведаю, — сунешыў ён. — Прымаюцца меры. Загадам міністра на будоўлі арганізуецца сваё будаўнічае ўпраўленне, так што начальства будзе на месцы...

Ну, што ж, абы, як кажуць, усё было добра...

Час ужо, здаецца, паставіць апошнюю кропку. Застаецца толькі дадаць: я шчыра веру, што ў хуткім часе змагу паехаць у Міхалкі па станоўчы матэрыял. Людзі ж там працуюць выдатныя, заўзятыя, ім па плячы любая справа, дайце магчымасць — горы звернуць.

З якім задавальненнем я напішу пра цесляра Міхаіла Жолудзя, які ў складзе геафізічнай экспедыцыі тры гады павандраваў па Беларусі ў пошуках нафты, потым цягнуў нафтаправод «Дружба», а тут, на будоўлі ў Міхалках, забіў першыя калкі, пра слесара Міхала Какору, які раней будаваў прамысловыя гіганты на Урале, пра мужа і жонку Аверыных, што прыехалі з-пад Ленінграда, бетоншчыцу Галю Яцухну з Казахстана, шафёра і цесляра Мікалая Забалоцкага з Валагды і многіх, многіх іншых.

Да сустрэчы, сябры!

М. ЗАМСКІ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

Мазыр — Міхалкі — Мінск.

ПАВУЧАЛЬНЫ ВОПЫТ МАЗЫРЧАН

Вось ужо другі год кінафікатары Мазырскага раёна трымаюць пераходны Чырвоны сцяг Гомельскага аблвыканкома і абласнога Савета прафсаюзаў за першынство ў сацыялістычным спаборніцтве сярод работнікаў кінасеткі Гомельскай вобласці. Летась кожны сельскі жыхар гэтага раёна ў сярэднім 13 разоў пабываў у кіно. Гэта ў паўтара раза вышэй, чым у сярэднім па рэспубліцы.

Паспяхова працуюць кінамеханікі Мазыршчыны сёлета. У сувязі з падрыхтоўкай да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна і 50-годдзем БССР і Кампартыі Беларусі яны распрацавалі канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на далейшае паляпшэнне работы.

У гонар юбілею рэспублікі тут праходзіць агляд кінаўстановак. За іх работай сістэматычна сочыць спецыяльная аглядавая камісія. Вынікі праверак яна абмяркоўвае на сваіх пасяджэннях або ўносіць іх на разгляд савета брыгадзіраў і агульных сходаў кінамеханікаў.

Прыемна адзначыць, што на Мазыршчыне пераабсталяваны ўжо ўсе стацыянарныя кінаўстаноўкі для паказу шырокаэкранных фільмаў. У Махновіцкім, Барысковіцкім і Крушнікоўскім сельскіх клубах адкрыты новыя стацыянарныя шырокаэкранныя кінаўстаноўкі. Прыведзены ў парадак усе экраны ў вёсках, устаноўлены новыя рэкламныя шчыты. Іх любоўна зрабілі самі кінамеханікі. Усе кінаўстаноўкі забяспечаны супрацьпажарным інвентаром. На памяшканні, дзе дэманструюцца фільмы, выдадзены пашпарты.

У раёне накоплены немалы вопыт па рэкламаванні і прапагандзе лепшых савецкіх фільмаў. Ва ўсіх клубах кінамеханікамі абсталяваны кінакуткі з рэкламнымі матэрыяламі. Актывісты культурна-асветных устаноў і кінагледачы ўсюды дапамагалі кінамеханікам абсталёўваць гэтыя куткі. Кінамеханікі цяпер робяць падворныя абходы насельніцтва, расказваюць аб змесце фільмаў, распаўсюджваюць білеты, пакідаюць пісьмовыя запрашэнні.

Калі Уладзімір Паповец першы раз пайшоў на дом да гледачоў, многія здзівіліся: ніводзін кінамеханік такога не рабіў. А гэты ходзіць па хатах, расказвае пра фільм, запрашае, агітуе, прапануе тут жа білет.

— Лішнюю работу, хлопча, даеш сабе, — гаварылі яму калгаснікі.

Але гэта не збянтэжыла Папоўца, ён заходзіў у хаты, на фермы, на ток, на поле і ўсюды гаварыў з людзьмі. І ўсім спадабалася гэта. Пачалі нават пагаворваць, што калі Уладзімір прыйшоў запрашаць у кіно, значыць фільм будзе добры, і спяшаліся набыць у яго білеты.

Настойлівая праца кінамеханіка дала свой плён. Калгаснікі пачалі часцей глядзець фільмы. Так, з 1333 жыхароў вёскі Слабада, дзе дэманструе фільмы Уладзімір Паповец, фільм «Моцныя духам» прагледзела больш як восемсот чалавек.

Свой почырк у рабоце ўдарніка камуністычнай працы кінамеханіка Скрыгалаўскага стацыянара Рыгора Косага. У мінулым годзе кожны жыхар в. Скрыгалава наведаў кіно 42 разы. Кінамеханік часта абмяркоўвае кінафільмы з дарослымі гледачамі. Перад пачаткам сеансаў тут праводзяць гутаркі дакладчыкі, палітінфарматары. Перыядычна перад кінагледачамі выступае агітбрыгада, якой кіруе загадчык клуба Г. Касінская і сам кінамеханік.

Дэманстрацыя фільма ўсюды цесна ўвязваецца з планамі юбілейных і ленінскіх чытанняў, вечароў, сустрэч са знатнымі людзьмі раёна. Перад пачаткам сеансаў выступалі ўдзельнікі Вялікага Кастрычніка, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, Г. Кухнавец, Ф. Валасюк, П. Крывянчук. Расказы непасрэдных удзельнікаў падзей, падмацаваныя кінафільмамі, пакідалі незабыўнае ўражанне ў сельскіх працаўнікоў, асабліва ў моладзі.

Не так даўно на савеце брыгадзіраў з удзелам многіх кінамеханікаў ішла вялікая размова, як палепшыць абслугоўванне дзяцей. На першы погляд здавалася, што прычыны для пастаноўкі такога пытання не было. Па дзіцячых кінасеансах планы заўсёды перавыконваліся. Напрыклад, у першым квартале 1968 года ў раёне наведала кіно на 16,8 тысячы дзяцей больш, чым за той жа перыяд мінулага года. Паспяхова прайшоў «Тыдзень дзіцячага фільма». Аднак кінамеханікі бачылі, што паказ фільмаў дзецям можна і трэба значна пашырыць. Многія пытанні, звязаныя з арганізацыяй дзіцячых сеансаў, яшчэ не вырашаны як дырэкцыяй кінасеткі, так і кіраўніцтвам школ. Таму на савет брыгадзіраў былі запрошаны і прадстаўнікі раённага аддзела народнай асветы. У выніку былі выпрацаваны і зацверджаны дырэкцыяй кінасеткі і раённым аддзелам народнай асветы сумесныя мерапрыемствы па далейшым паляпшэнні выкарыстання кіно для камуністычнага выхавання падрастаючага пакалення.

Цяпер у раёне ўстаноўлены цвёрды парадак: у агульнавыхадныя і святочныя дні, а таксама ў дні школьных канікул арганізоўваецца і праводзіцца не менш чым па адным дзіцячым кінасеансе на стацыянарах, а на перасоўках па адным сеансе на тыдзень у кожным пункце кінапаказу. У школах, якія маюць неабходныя ўмовы, арганізаваны школьныя кінатэатры на грамадскіх пачатках.

Палепшылася рэклама дзіцячых фільмаў. У радзе школ абсталяваны і ўстаноўлены спецыяльныя шчыты і стэнды «Кіно — дзецям», «Навіны дзіцячага экрана». Створаны ўмовы для паказу фільмаў непасрэдна ў школах: зацемнены вокны, набыты супрацьпажарны інвентар. На кожным дзіцячым сеансе дзяжураць настаўнікі і піянерважатыя школ. Месячны рэпертуар фільмаў для дзяцей дырэкцыя кінасеткі ўзгадняе з раённым аддзелам народнай адукацыі. Улічваюцца заяўкі школ.

У асенне-зімовы перыяд праводзяцца двухмесячнікі і кінафестывалі навукова-папулярных сельскагаспадарчых фільмаў. Як правіла, перад сеансамі выступаюць спецыялісты сельскай гаспадаркі, кіраўнікі калгасаў і саўгасаў. У летні час дэманструюцца ў асноўным новыя праграмы, якія паступаюць у пракат.

Поспех у рабоце кінасеткі Мазырскага раёна забяспечваюць перш за ўсё людзі, кадры. У раёне склаўся добры калектыў кінамеханікаў, сапраўдных энтузіястаў сваёй справы. Сярод іх камуністы Канстанцін Лузан, Мікалай Капыловіч, Рыгор Судзібор, Франц Пятроўскі, Пётр Сенькін і Мікалай Пікуза, якія працяглы час і добра працуюць, і перадаюць свой вопыт і веды таварышам па рабоце.

Трэба адзначыць, што выхаваўчая работа з кінамеханікамі тут не абмяжоўваецца палітычнай і тэхнічнай вучобай. Усе кінамеханікі праз савет брыгадзіраў і мясцовы камітэт прафсаюза прыцягваюцца да актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці калектыву, да практычнага ажыццяўлення тых мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў раёне ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем БССР і Кампартыі Беларусі і з 100-годдзем з дня нараджэння У. І. Леніна. Савет брыгадзіраў і мясцовы камітэт прафсаюза з'яўляюцца асноўнай апорай дырэкцыі кінасеткі ў выхаваўчай рабоце з кінамеханікамі.

Уся гэтая карпатлівая работа прыносіць добры плён. План 6 месяцаў 1968 года па абслугоўванні гледачоў выкананы на 117,4 працэнта. У параўнанні з такім жа перыядам мінулага года колькасць абслужаных гледачоў узрасла амаль на 55 тысяч чалавек.

Р. ЖУК,
намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення кінафікацыі і кінапракату Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ

Міхасю ПЯНКРАТУ — 50 гадоў



Споўнілася 50 гадоў пісьменніку Міхасю Пянкрату. У сувязі з гадавінай праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Паважаны Міхаіл Міхайлавіч!

Прыміце шчырае, сардэчнае віншаванне ў дзень Вашага 50-годдзя.

Вы належыце да пісьменніцкага пакалення, якое пачало сваю працу ў літаратуры ў перадваенныя гады, потым прайшло праз полымя Вялікай Айчыннай вайны і разгарнула свае творчыя сілы ў пасляваенны час. Выступіўшы спачатку як паэт, Вы затым праявілі свае здольнасці ў жанры мастацкай прозы. Вашы кнігі «Палын і кветкі», «Простыя людзі», «Шчасце маё», «Ведрыцкія напевы», як і іншыя Вашы творы, набылі вядомасць сярод чытачоў.

Папулярна Ваша імя і як гумарыста і сатырыка, актыўнага супрацоўніка часопіса «Вожык», аўтара шматлікіх вострых фельетонаў, сатырычных апавяданняў і гумарэсак.

Жадаем Вам, Міхаіл Міхайлавіч, добрага здароўя, доўгіх год жыцця, новых творчых поспехаў».

Газета «Літаратура і мастацтва» таксама віншуе юбіляра і зычыць яму ўсяго найлепшага.

БУДЗЬ МАЛАДЫ, ДРУЖА!

— Міхасю Пянкрату — пяцьдзесят? Не можа быць!

«Пяцьдзесят» — і ўзнікае воблік сапраўды ўжо немаладога чалавека, над знешнасцю якога грунтоўна-такі папрацаваў час. У Міхася ж — ніводнага сівога воласа. Густая чорная чупрына звісае такой жа непаслухмянай капой, як і калісьці. І хоць за яе часта хапаюцца... мастакі, малюючы на яго сяброўскія шаржы, яна ў яго зусім не парадзела. Так што з гэтага боку цяжка і праўда паверыць, што Міхасю Пянкрату — пяцьдзесят.

Ну, а калі глянуць на тое, што ён піша? Зноў-такі, усе яго творы прасякнуты маладым задорам, іскрыстай жыццерадаснасцю. Адчуваецца, што чалавек, які стварыў іх, мае такую ж іскрыстую, маладую душу. Ён сам аднойчы прызнаваўся:

Не зайздрошчу, як калісьці, — годзе!
Хоць ты крыкні: месяц, паглядзі,
У маім жыцці не хоча сходзіць
Юнацтва вечны маладзік.

І ўсё ж Міхасю Пянкрату — пяцьдзесят. А пяцьдзесят — пара сталасці, у тым ліку і творчай сталасці. І мне прыемна адзначыць, што з кожным новым творам Міхась Пянкрат усё глыбей і глыбей пранікае, як кажуць, у сутнасць жыцця. Хораша, з вялікай павагай і любоўю малюе ён сваіх герояў — людзей працы.

Але Міхась Пянкрат не толькі лірык, але і сатырык. У яго нямала твораў, дзе трапным сатырычным словам бічуецца ўсё адсталае, коснае, шкоднае, усё тое, што перашкаджае нам жыць і працаваць...

Жыццё ў Міхася Пянкрата было не лёгкае і не гладкае. Ён быў салдатам, быў партызанам, бачыў пакуты і смерць. Але, нягледзячы на ўсё гэта, ён не страціў юнацкага задору, балдзёрасці, аптымізму.

І сёння, калі мой сябра ступіў на прыступку шостага дзесятка, хочацца шчыра пажадаць яму быць такім жа маладым і вясёлым і ў семдзесят гадоў, і ў дзевяноста, і ў сто з гакам.

Валянцін ЗУБ.

З пошты ЛіМа

СЦЕЖКАМІ БІТЫМІ І НЯХОДЖАНЫМІ

Вось ужо каля года ў эфіры гучыць радыёчасопіс «Кнігалюб». Яго выпускаюць супрацоўнікі галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання Дзяржаўнага камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанні. Разлічаны часопіс на тых, каго аб'ядноўвае любоў да кнігі. Паказваць кнігалюба з усімі яго радасцямі і бедамі — такая высакародная і, трэба прама сказаць, далёка не лёгкая задача пастаўлена перад радыёчасопісам.

Нумары, якія прагучалі ў эфіры, на маю думку, паказваюць, што рэдактары «Кнігалюба» на правільным шляху. Аб гэтым сведчаць лепшыя матэрыялы радыёчасопіса. Перш за ўсё хочацца назваць выступленне С. Грахоўскага. У гутарцы «Служба Дабру» (20.IV.1968 г.) пісьменнік з вялікай цеплынёй расказаў пра генерала ў адстаўцы Якава Іванавіча Драйчука і яго жонку Зінаіду Васільеўну. Гэтыя людзі на ўласныя зберажэнні набылі 17 тысяч тамоў кніг і пабудавалі будынак для бібліятэкі на радзіме генерала — у сяле Ржаўка Слаўгарадскага раёна.

Несумненна, для слухачоў быў цікавы расказ М. Аўрамчыка пра гісторыю напісання і выдання кнігі Аляксея Коршака, паэта, які загінуў салдатам на фронце і застаўся салдатам у літаратуры. Расказ гучаў тым больш пранікнёна (20.IV. 68), што расказчык асабіста ведаў аўтара, адным з першых пазнаёміўся з яго рукапісамі і рэдагаваў зборнік «Апаленыя пялёсткі». Праўда, з перадачы засталося незразумелым, чаму пра кнігу, выдадзеную ў 1963 годзе, загаварылі сёлета. Рэдакцыі варта было б хоць адным сказам растлумачыць прычыну гэтага.

Што робяць літаратары Балгарыі і Беларусі для ўзаемнага ўзбагачэння культурных скарбонак братніх народаў? Аб гэтым расказваў Ніл Гілевіч (18.V. 68). Шкада, што цікавае выступленне было ўціснута ўсяго ў чатыры мінуты.

Своеасаблівы экскурс у мінулае выдавецкай справы зрабілі радыёслухачы разам з загадчыкам беларускага аддзела Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна М. Васілеўскім. Ён расказаў аб першых выданнях нашых класікаў, аб лёсе гэтых рэдкіх кніг. І вельмі добра, што ў наступным нумары радыёчасопіса ў адказ на гутарку работніка бібліятэкі выступіў паэт П. Пранузя. Ён расказаў пра гісторыю аднаго экземпляра купалаўскай «Жалейкі», якая стала бібліяграфічнай рэдкасцю, потым прачытаў вершы, прысвечаныя аўтару «Жалейкі».

Амаль у кожным нумары радыёчасопіса змяшчаюцца апавяданні аб уладальніках асабістых бібліятэк, вялікіх аматарах кніг. І сапраўды, гэтыя людзі варты таго, каб удзяліць ім такую вялікую ўвагу. На жаль, усе расказы пра аматараў кніг да крыўднага аднатыпныя, зроблены па адной схеме: карэспандэнт з'яўляецца ў кватэры, просіць гаспадара назваць дзесятак-другі тамоў, якія стаяць на кніжнай паліцы, пад канец задаецца стэрэатыпнае пытанне — хто, акрамя членаў сям'і, карыстаецца бібліятэкай. А можна ж знайсці многа спосабаў, каб ярка расказаць аб энтузіястах-збіральніках, бо ў сельскай мясцовасці кожная асабістая бібліятэка ператвараецца часам у грамадскую, у сапраўдны ачаг культуры.

Натуральна, «Кнігалюб» не павінен праходзіць міма грамадскіх бібліятэк. Але за паўгоддзе на гэту тэму змешчана ўсяго адно інтэрв'ю з загадчыцай гомельскай цэнтральнай бібліятэкі імя Герцэна С. Кузьменка. Мне думаецца, што абыходзіць увагай такую густую сетку бібліятэк, якая створана ў нашай рэспубліцы, не гаварыць аб іх велізарнай ролі ў выхаванні людзей нельга.

Радыёчасопіс знаёміць сваіх слухачоў і з навінкамі беларускіх выдавецтваў. Але пакуль што матэрыялы пад рубрыкай «На кніжнай паліцы» капіруюць газетныя інфармацыі таго ж профілю. Для радыё ж лепш было б расказаць аб адной-дзвюх кнігах, але так, каб гэта запомнілася слухачу, каб ён сапраўды адчуваў патрэбу заўтра ж пайсці ў кніжны магазін...

Кніга — гэта вынік работы не толькі пісьменніка і паліграфістаў. Да яе прыкладваюць руку і мастакі. «Кнігалюб» дапамагае сваім слухачам «зазірнуць» да афарміцеляў — мастакоў-ілюстратараў. У адным з нумароў гэтаму прысвечана была гутарка з мастаком В. Шаранговічам. На жаль, расказаў пра такія сустрэчы ў майстэрнях мастакоў-афарміцеляў даецца пакуль што малавата.

Перш чым трапіць у грамадскую або асабістую бібліятэку, кніга праходзіць гандлёвую сетку. Як гэта робіцца? Адказ на пытанне змяшчаецца ў такіх матэрыялах, як рэпартаж «За тысячы небасхілаў» — аб рабоце аддзела «Кнігаэкспарт» рэспубліканскай кніжнай базы. Цікавымі былі матэрыял, прысвечаны рабоце адной з кнігарань Мінска, і расказ М. Тычыны пра кнігаёношу В. Барадзіча са Слуцка.

Наўрад ці закранаюць сэрцы радыёслухачоў водгукі чытачоў аб кнігах, якія змяшчаюцца ў «Кнігалюбе». Ды і то за паўгоддзе іх было ўсяго два — на раманы І. Шамякіна «Сэрца на далоні» і І. Мележа «Людзі на балоце».

У планах рэдактараў «Кнігалюба» прадугледжваюцца і дыскусіі, і рэпартажы з канферэнцый чытачоў, дзе, як вядома, часта скрыжоўваюцца шпагі. Намячаецца прысвяціць некалькі матэрыялаў недахопам у абслугоўванні кнігалюбаў, вывучэнню іх попыту і г. д. Карацей кажучы, няходжаных сцежак многа, і на кожнай з іх можна знайсці карысныя для радыёслухачоў знаходкі.

М. ЧАПРАСАЎ.

У гарадскім пасёлку Альбярцін, што пад Слонімам, ёсць кардонная фабрыка «Беларусь». Ёсць у пасёлку і цудоўны фабрычны парк. Раскінуўся ён на беразе маляўнічага возера. Любяць адпачываць у сваім парку рабочыя і служачыя фабрыкі, прыходзяць часам туды цэлымі сем'ямі. Для дзяцей у парку пабудаваны «Вясёлы гарадок». Дарослых больш вабіць Палац культуры, дзе можна паслухаць лекцыю ці даклад, паглядзець канцэрт самадзейнасці, прыняць удзел у дыспуце.

На здымку фотакарэспандэнта БЕЛТА А. Перахода вы бачыце куток Альбярцінскага парка ля Палаца культуры.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

БРЭСТЧЫНАЙ НАТХНЁНЫ

У акруговым Доме афіцэраў адкрыта персанальная выстаўка твораў брэсцкага самадзейнага мастака, старшыны звыштэрміновай службы І. Ламакіна.

Экспазіцыю склалі больш за сто работ — жывапіс і графіка.

Вось кампазіцыя «Подзвіг старшага сяржанта Швадронава», якую І. Ламакін напісаў разам са сваім калегам — таксама самадзейным мастаком І. Селіхавым. На карціне адлюстраваны батальны эпізод. Мы бачым два фашысцкія танкі, падбітыя савецкімі байцамі. Яны ахоплены полымем і дымам. А на пярэднім плане карціны — старшы сяржант Швадронаў, які збіраецца падарваць гранатамі фашысцкі танк.

Шмат пейзажаў прысвячае мастак легендарнай крэпасці над Бугам: «Холмскія вароты», «Крэпасць», «Асенні эцюд», «Гераічная крэпасць», «Казематы Брэсцкай крэпасці», «Крокі вайны» і інш.

На выстаўцы шмат эцюдаў. Не ўсе яны аднолькава ўдалыя. Лепшыя — «Шэры дзень», «Ускраіна Брэста», «Рака», «Вечная памяць».

Наведвальнікі выстаўкі пакідаюць у кнізе водгукаў запісы аб сваіх уражаннях. Так, напрыклад, мастак З. Паўлоўскі піша: «Вельмі рады, што сярод савецкіх воінаў ёсць мастакі, якія маюць густ і прафесіянальнае майстэрства...» А вось запіс інжынера Н. Карнілавай: «...У яго такая паэтычная душа... Вельмі спадабалася карціна «Подзвіг старшага сяржанта Швадронава». Глядзіш і не нарадуешся таленту самабытнага мастака...»

І. Ламакін — пастаянны ўдзельнік акруговых, рэспубліканскіх, усеармейскіх выставак твораў выяўленчага мастацтва, перасоўных выставак ЦДСА. Яго першая персанальная выстаўка пасля паказу ў Мінску накіруецца ў падарожжа па воінскіх часцях БВА.

Д. МАСЛАЎ.

МЯСЦІНЫ, СЭРЦУ ЛЮБЫЯ

Ваколіцы Мінска і Лагойска, Маладзечна і Барысава, шматлікія маляўнічыя куткі Беларусі з натхненнем адлюстроўвае ў сваіх творах жывапісец М. Даўгяла. Лепшыя яго творы паказаны на нядаўна адкрытай у Мінскім мастацкім салоне-магазіне персанальнай выстаўцы, прысвечанай 60-годдзю з дня нараджэння мастака.

Больш трыццаці гадоў аддаў мастак творчасці. Ім набыты немалы вопыт. Пра гэта сведчаць многія пейзажы, уключаныя ў экспазіцыю выстаўкі.

Наведвальнікі выстаўкі затрымліваюцца ля карцін «Бурны дзень», «Перад навальніцай», «Беларускі пейзаж», — тут мы пазнаём нашу маляўнічую Лагойшчыну.

Любыя сэрцу мастака мясціны, дзе нарадзіліся і правялі дзяцінства песняры нашага народа Янка Купала і Якуб Колас. Гэтым мясцінам прысвечаны шэраг работ мастака.

Ёсць на выстаўцы і тэматычныя творы («Вясна ў калгасе», «Вывазка торфу»), нацюрморты, партрэты.

Каля сотні твораў увайшло ў экспазіцыю. І кожны сведчыць аб вялікай любві мастака да роднага краю.

М. ДЗМІТРЫЕЎ.

Палеміка

ПАЭЗІЯ — ГОЛАС НАРОДА

РАДАСНА бачыць напярэдадні пяцідзесяцігоддзя БССР і Кампартыі Беларусі і стагоддзя з дня нараджэння правадыра народаў У. І. Леніна, як добра расцвіў паэтычны сад нашай рэспублікі.

Яшчэ ў далёкія, змрочныя гады, задоўга да рэвалюцыі, умела і клапатліва закладвалі гэты сад мудрыя садоўнікі Янка Купала і Якуб Колас. Паэзія нашых класікаў сваімі карэннямі трывала ўрасла ў народнае жыццё, якое і напаўняла іх творы шчырасцю, мужнасцю, праўдай. Купала і Колас на ўвесь голас выказалі гора і радасць, надзеі і мары свайго народа, свайго часу.

На высокіх узорах вялікіх народных песняроў вучыліся і вучацца многія нашы паэты. У салаўіным садзе паэзіі Купалы і Коласа ўзгадаваліся вядомыя паэты 20—30 гадоў, паэты Вялікай Айчыннай вайны і сённяшніх дзён.

Аднак наша сучасная паэзія сёння не на нейкім сваім юбілеі даспелай, пажоўклай восені, і ў мэтах далейшага яе развіцця мы павінны часцей і, галоўнае, прынцыпова абмяркоўваць і тое, што замінае ёй ісці наперад, быць заўсёды ў авангардзе сучаснасці і весці за сабою народ да таго запаветнага берагу, імя якому камунізм.

Спытаем сябе: ці ўсе мы цвёрда стаім на фундаменце народнасці, партыйнасці ў паэзіі? Ці заўсёды прабіваецца яна сваімі карэннямі ў глыбіні народнага жыцця, ці шчодра чэрпае з гэтых жывых і глыбокіх крыніц?

Не сакрэт, што яшчэ ў нас малавата паэтаў «рабочай» тэмы, а дакладней, тых паэтаў, якія глыбока пранікаюць у жыццё і побыт людзей на фабрыках і заводах, на шахтах і новабудоўлях. Малавата яшчэ песняроў горада. А чаму? Відаць, таму, што малавата было і саміх узораў такой паэзіі, на якіх бы маглі вучыцца новыя паэты. Большасць з іх —гадаванцы вёскі, прыйшлі яны ў горад, ускалыханыя жніўнымі песнямі, і дагэтуль з далечыні відаць ім, як аруць і сеюць хлебаробы, як яны косяць, стагуюць сена, малоцяць снапы.

А ці ўсім нашым маладым паэтам вядома, што і на літаратурнай ніве трэба працаваць натхнёна, старанна, глыбока ўздымаючы пласты народнага жыцця? Зразумела, цяжка, не ўмеючы, упершыню праклаcці роўную, глыбокую баразну, але яе трэба праклаcці. Рашуча забараняецца коўзацца старэнькай тупою бараною па гатовым чужым ворыве!

Вельмі часта бывае, калі малады сейбіт паэзіі ідзе па чужой баразне, па пратаптанай разоры, калі малады шпачок спявае з чужога голасу. Пералятае ён з галінкі на галінку, прыслухоўваецца: «Чакай, давай паслухаем «моднага» жорава. Ягоныя песні хваляць. Буду і я гэтак трубіць!» Але хутка тыя трубныя песні выходзяць з моды. У другі бярэзнік ляціць літаратурны шпачок, да іншых галасоў прыслухоўваецца: «Ага, вунь якія трэлі ў бярэзніку! Давай і я гэтак сыпану».

І пачынае сыпаць! І нельга вылучыць яго ўласнага голасу з многіх іншых галасоў. Нельга яго ўласны верш вылучыць з вершаў іншых аўтараў. Няма ў тым вершы ні свежасці, ні самабытнасці. Трапіў паэт пад чужы ўплыў, і хай сабе ён моднічае, і мудрагеліць, і выпінаецца, а ўсё ж не арыгінальны, не новы, не цікавы ён паэт!

Яшчэ раз напомнім: на літаратурнай ніве трэба перш за ўсё праклаcці сваю ўласную баразну, трэба сваёй жменяй сыпануць праменістыя, жывыя зярняты сэрца. Толькі так! Тады закрасуюць, нальюцца, зазвіняць залатыя каласы новай паэзіі.

Працай, несупыннымі пошукамі здабываецца тая глыбінная руда, якая пераплаўляецца ў паэзію. Бывае, што на пачатку літаратурнай дзейнасці маладога паэта могуць выручыць талент, нейкія ўдалыя абставіны, шчаслівы выпадак, але сапраўднага, працяглага поспеху ў яго не будзе без упартай штодзённай працы, без паглыблення ў жыццё народа, без высокай задачы, грамадзянскага пафасу і акрыленасці.

Пра гэтыя высокія задачы, пра майстэрства мастака, пра некаторыя іншыя праблемы нашай паэзіі і пачалася размова на старонках «Літаратуры і мастацтва».

«Можна сказаць, завязалася невялічкая палеміка, — піша Н. Гілевіч, — незалежна ад таго, на чыім баку больш праўды і справядлівасці, — парадуемся спярша таму, што размова аб сённяшнім стане нашай паэзіі завязалася».

А чаму «незалежна ад таго, на чыім баку больш праўды і справядлівасці»? Гэта ж надзвычай важна якраз і высветліць, дайсці да самой праўды!

С. Грахоўскі зазначае, што аўтар артыкула «Майстэрства, што з табою рабіць?» Р. Бярозкін нібыта «з аднабаковым намерам» прачытаў зборнік П. Макаля «Акно». Б. Бур'ян, наадварот, падкрэслівае сваю згоду з рэцэнзентам: «Я разумею крытыка — тое, што псуе ўражанне ад вершаў П. Макаля, выклікае... эмоцыі пратэсту супраць бязлітаснай эксплуатацыі «майстэрства», што дае ў выніку на дзіва прэтэнцыёзныя страфы і вершы».

І сапраўды, як мог вопытны, таленавіты паэт напісаць такія безгустоўныя радкі, як мог гэтак холадна, па-кніжнаму і мудрагеліста выказаць пачуцці да каханай:

Таму, як малітву штодзённую,
Я чытаю цябе запоем,
Усю—
Ад загалоўка валасоў
І да шматкроп'я пацалункаў—
Перад тым,
Як забыцца сном.

А такіх узораў штучнай і завіхрастай паэзіі многа ў зборніку «Акно». Гэтыя хібы і паказаў у сваім артыкуле Р. Бярозкін, адкрыта звярнуўшы ўвагу паэта на тое, што ён у многіх вершах пачынае занадта эксплуатаваць унутранае сугучча, забаўляцца ім. Крытык прыводзіць такія радкі: «На пляжы спляжу немачы свае і змору патаплю ў бяздонным моры», «яснасці — чэснай уласнасці не закілзанага розуму», «толькі фрэскі, як трэскі, з эрмітажаў дамоў», «кантрабандай з таверны — пырсне слова з пяра...» і г. д.

Што гэта такое? Нейкія загадкі, нейкая шкарлупіна, не запоўненая зярнятамі думкі і пачуцця.

На жаль, з кнігі ў кнігу П. Макаля трапляюць вершы, перагрувашчаныя залішняй «тэхнікай», завіхрастасцю, уяўнай філасафічнасцю, пра што я ўжо ў свой час гаварыў у рэцэнзіі на зборнік П. Макаля «Вечны агонь», якая называлася «Халодны агонь».

У сваім артыкуле «Яшчэ раз пра варэнне і цукар» А. Вярцінскі таксама адзначае тыя ж хібы ў некаторых вершах П. Макаля: «Відаць паэт залішне захапляецца алітэрацыямі і асанансамі... Піша часам аблегчана, часам сапраўды трапляе ў палон слоўна-гукавай гульні...», «перабірае меру ў некаторых вершах з параўнаннямі: параўнанне на параўнанні...» і г. д. І тут жа па-дружбацку паляпвае паэта па плячы, суцяшае яго: «Але гэта не такая ўжо бяда...» А чаму, уласна кажучы, не бяда? Таму, бачыце, што «без гэтага вось «нанізвання», без асацыятыўнага разгортвання тэмы няма Маякоўскага...» І ад Маякоўскага адразу перакінута кладачка да А. Вазнясенскага, нібыта, тое ж «нанізванне» дапамагае і яму.

Не буду спрачацца наконт Вазнясенскага, але сказаць, быццам Маякоўскі займаўся нейкім бязмэтным, дзеля чыстай тэхнічнасці, халодным «нанізваннем», значыць сказаць няпраўду пра вялікага паэта, які перш за ўсё якраз і вылучаўся агромністай непасрэднасцю пачуцця і «асардэчанасцю» сваёй выдатнай тэхнікі, усё роўна пісаў ён пра рэвалюцыю ці пра каханне.

А што такое — «асацыятыўнае разгортванне тэмы»? Няўжо вось гэта: «У пафасным уступе, як у ступе, ваду вядомых слоў таўчы штодня, пакуль алоўкам па стале не стукне, нібыта лёс няўмольны, старшыня»?.. С. Грахоўскі адчуў у гэтых радках «паліфанічнасць слова... гукапіс нашай мовы». А па-мойму, гэта нішто іншае, як эквілібрыстыка, слоўна-гукавая гульня! І трывожыць нас тое, што вось ужо доўгі час П. Макаль не можа выбіцца з палону гэтай гульні, з палону «тэхнікі» і «ўмельства», якія не трэба блытаць з праўдзівым майстэрствам.

Пачатая размова пра паэзію датычыць не аднаго толькі П. Макаля: у сказаным пра яго добра ўбачаць сябе многія паэты, і перш-наперш такія, як Р. Тармола і А. Наўроцкі.

Р. Тармола выдаў тры зборнікі вершаў, але ўклад іх у нашу паэзію, як мне здаецца, мог быць і значнейшым: круг інтарэсаў паэта звужаны, вершы не напоўнены высокім пафасам жыцця, жывымі галасамі сучаснасці; у іх многа цьмянасці і павярхоўнай, уяўнай філасафічнасці.

Вось, напрыклад, новы верш Тармолы, надрукаваны ў другім нумары часопіса «Полымя» за гэты год:

Ніхто не лічыў шаленствам,
Калі галасіў: я' са-а-ам...
Найлепшай маленства песняй
Я сам назаву «Я сам».
А вёсны не сушаць вёслы
(Хто каго сушыць?— **А. Б.**)
Сплываць і сплываць гадам...
Як трэба і нам, дарослым,
«Я сам» ваяўляць, «Я сам»!

Паспрабуйце праз гэту туманную заслону дайсці да нейкай жывой, вартай верша думкі — усё тут цьмяна: і тое, што аўтар прымае за думку, і тыя словы, у якія вылілася ўся гэтая непрадуманасць.

Таксама некаторыя вершы А. Наўроцкага ахутаны нейкай захмаранасцю, нейкія цені ў іх, а не канкрэтныя жывыя вобразы.

У трэцім нумары часопіса «Маладосць» за гэты год надрукавана нізка вершаў А. Наўроцкага. Нават не вершы — эскізы, накіды, загатоўкі да вершаў.

Сядзіць паэт, і «лапаткай-лыжачкай моўчкі марожанае «наварачвае», сядзіць, углядаецца, услухоўваецца; «раптам рычагі праляскалі — праехаў, як прывід, у сваёй калясцы інвалід», убачыў у «нейкай дзяўчыны... шпількі-абцасікі», «губы ў памадзе адвіслі, падпудраваны нос. Той памадай падкісліць нехта свой лёс»; не хочацца паэту з «рыфмаў-слоў, як з пясочку», пячуркі ляпіць, а яны ляпяцца!, і «чуе адна толькі ліпа мой важкі ўздых...» Хто мне растлумачыць, пра што і навошта гэта? Адна толькі гультаяватасць думкі, інертнасць, вяласць душы, і таксама пры відавочнай прэтэнзіі на «асацыятыўнае разгортванне тэмы»...

Н. Гілевіч у сваім артыкуле «Крыху роздуму ў сувязі...» гаворыць пра лёс свайго пакалення: у цяжкія гады нарадзілася, труднавата жылося пазней, а што да пачаткоўцаў, то марудна выдаваліся іх кніжкі...

Гэта — праўда. Але ёсць і другая праўда: ці многія з пакалення Н. Гілевіча, скончыўшы інстытуты, паехалі ў вёску, у раён, нават у абласны цэнтр? Усё больш у рэдакцыях газет і часопісаў, на тэлебачанні ўладкаваліся, а некаторыя прафесіяналамі сталі. Мала ў іх жыццёвага вопыту, практыкі мала...

Мы, паэты, у даўгу, у вялікай адказнасці перад зямлёю, перад хлебаробамі. А некаторыя крытыкі, ды і не толькі крытыкі, сцвярджаюць, нібыта вёска стала залішне традыцыйнай тэмай, нібыта яна — пройдзены этап у нашым жыцці, у нашай новай яве.

Дарэчы, аб крытыцы. Няма ў яе маштабнага мыслення, мала глыбокіх артыкулаў пра нашу паэзію. Вялікую трывогу выклікае тое, што некаторыя крытыкі друкуюць толькі трактаты пра класікаў, зусім не пішуць пра сучасную паэзію. Трывожыць і тое, што некаторыя крытыкі, нібыта спрактыкаваныя ювеліры, бяруць на зуб радок, страфу верша, спрабуюць вызначыць пробу, крывяцца: «Не тое, не чыстае золата! Вялікая прымесь сацыяльнай, гучнай інтанацыі». І патрабуюць гэтыя крытыкі нейкага незразумелага падтэксту, эзопаўскай мовы, вышкляцаванага бляску. Яны, гэтыя крытыкі, не акрыляюць нашых паэтаў на ўзлёт, на высокі пафас у творчай працы, а хутчэй уносяць блытаніну, няправільны тон задаюць паэзіі.

Крытыка павінна быць глыбокай, разумнай, прынцыповай, добразычлівай. Крытыку трэба пранікаць у духоўны свет, у вобразную сістэму кожнага паэта, а не тузаць яго, не крычаць яму: «Гэта не модна, гэта не ў маім гусце!». А, можа, у цябе самога няма добрага густу, няма высокага пачуцця адказнасці перад сучаснасцю? Ты мяне цягнеш у нейкую халадзіну пустэльнай абстракцыі, а мне чуюцца жывыя галасы зямлі: «Не цурайцеся мяне, людзі! Ускарміла, узгадавала я вас, дарагія людзі!»

Ёсць у нашай прозе шырокапланавыя раманы, ёсць добрыя аповесці пра зямлю, пра слаўных, працавітых людзей калгаснай вёскі, а яркіх, арыгінальных паэм чамусьці няма. А даць бы пра нашу калгасную вёску, пра яе людзей паэму такой магутнасці, як «Новая зямля» Якуба Коласа!.. Цёплаю хваляю заплывае ў сэрца шчыры, задушэўны голас паэта:

Мой родны кут! Як ты мне мілы!
Забыць цябе не маю сілы!..

З далёкіх дзён, з маленства бачу яркія вобразы, жывыя, шырокія карціны жыцця, чую водар сасняк0ў і красак, пах той «Новай зямлі».

Напоўніць паэму такой сілай, даць такія праўдзівыя характары і шырокія карціны паэт змог таму, што добра ведаў жыццё сваіх герояў, думамі, помысламі пранік у думы, у сэрцы людзей...

Бывала, з вясны да восені жыў Янка Купала ў Ляўках на Аршаншчыне. Не дачнікам, не пабочным наглядальнікам ён там жыў. І на сенакосе, і на жніве, і ў калгасных хатах на вечарынках часта бачылі людзі свайго любімага паэта. Цікавасць да жыцця, да чалавека працы заўсёды жылі ў сэрцы паэта. Трывогі і радасці, клопаты і турботы чалавечыя былі яго трывогамі і радасцямі, клопатамі і турботамі. Найвялікшае замілаванне да новай явы, да хараства жыцця, гімн чалавеку працы — у праменістых, шчырых творах народнага песняра...

Разумнымі рашэннямі партыі і ўрада калгаснае жыццё ўмела пушчана ў новае рэчышча. Высокі, пачэсны абавязак паэта — сваімі натхнёнымі песнямі (калі карыстацца вядомым выразам В. Таўлая) калыхаць імклівы паход наперад.

Думаецца, на гэта і трэба нацэліць нашу дыскусію, нашу прынцыповую размову пра паэзію, што разгарнулася ў газеце «Літаратура і мастацтва».

Антон БЯЛЕВІЧ.

ВОДГУКІ, АДКАЗЫ

«СЕЛЬМАГ, КНІЖНАЯ ПАЛІЦА»

Пад такім загалоўкам у «Літаратуры і мастацтве» быў змешчаны артыкул М. Бярэзінскага. Як паведаміў рэдакцыі старшыня праўлення Бабруйскага райспажывсаюза Ф. Балыка, выступленне газеты абмяркоўвалася на пасяджэнні праўлення райспажывсаюза. Намечан рад мерапрыемстваў па паляпшэнні гандлю кнігай. Павялічаны завоз мастацкай, дзіцячай і спецыяльнай літаратуры, падручнікаў у спецыялізаваныя кнігарні, што размешчаны ў вёсках Дзеднава, Бортнікі, гарадскім пасёлку Глуша. У ліпені пачала працаваць кніжная аўталаўка.

Пытаннямі кніжнага гандлю ў райспажывсаюзе займаецца цяпер работнік са спецыяльнай адукацыяй.

Намечана расшырыць сетку спецыялізаваных кнігарань. У 1969 годзе будзе пабудаваны яшчэ адзін такі магазін.

ЛЯНОК, ЛЯНОК...

З якіх толькі матэрыялаў не спрабуюць мастакі рабіць цацкі, сувеніры! Яны ўжываюць саломку, стружкі, траву, карэньчыкі і галінкі дрэў, тканіны і шмат чаго іншага—была б толькі фантазія!.. Ніна Максімава, Зінаіда Ляўчэня і Раіса Брысюк, якія працуюць на Маладзечанскай фабрыцы мастацкіх вырабаў, знайшлі «свой» матэрыял—лён.

Паглядзіце, якія цудоўныя атрымаліся сувеніры.

Р. ВАЛАДЗЬКО.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ БССР — АБМЯРКОЎВАЕМ ВЫЛУЧАНЫЯ ТВОРЫ

ЗАПРАШЭННЕ ДА РОЗДУМУ

Сімфанічныя творы беларускага кампазітара Льва Абеліёвіча выконваюцца на многіх канцэртных эстрадах краіны — у Мінску і Маскве, на Урале і ў Сібіры, у рэспубліках Прыбалтыкі... Звычайна ў яго музыцы адзначаюць такія рысы, як драматычнае напружанне пачуццяў, светлы аптымізм, узнёсласць жыццёвых ўражанняў. Па-майстэрску валодае кампазітар аркестравым шматгалоссем.

Наўрад ці памылімся мы, калі скажам, што шырокі дыяпазон творчых пошукаў кампазітара садзейнічае і маштабнасці яго праграмных сімфанічных твораў. — Л. Абеліёвіч піша п'есы для аркестра беларускіх народных інструментаў, камерныя інструментальныя творы, хоры і рамансы на паэтычныя тэксты Я. Коласа, М. Багдановіча, Я. Журбы, М. Танка, У. Дубоўкі, на вершы А. Міцкевіча і П. Неруды, музыку да драматычных спектакляў і радыёпастановак. Такім чынам, ідэйна-мастацкія інтарэсы кампазітара звязваюць яго з рознымі пластамі жыцця.

Цікава, што Л. Абеліёвіч вучыўся ў трох кансерваторыях— спачатку ў Варшаве, потым у Мінску (клас прафесара В. Залатарова) і ў Маскве, дзе ён удасканальваў сваё майстэрства пад кіраўніцтвам прафесара М. Мяскоўскага. Пра такіх кампазітараў звычайна гавораць, што ў іх добрая школа.

Усё гэта мы зноў адчулі, калі пачалі рэпеціраваць Трэцюю сімфонію Л. Абеліёвіча ў верасні мінулага года. Першае знаёмства з партытурай паказала, што пасля Другой сімфоніі кампазітар перажыў творчы ўздым.

Трэцяя сімфонія — гэта глыбокі драматычны роздум чалавека нашага часу пра тое, што адбываецца ў свеце, і пра асабістае месца ў канфліктах сучаснасці. У гэты роздум «урываюцца» цяжкія, трагедыйныя ўспаміны пра вайну. Яны ўносяць трывогу ў агульную музычную плынь, бо гэта не толькі ўспаміны, але і адчуванне жахаў новай катастрофы, якой пагражаюць свету прэтэндэнты на сусветнае панаванне.

Хвалююць і лірычныя старонкі сімфоніі. Кантрастуючы з тэмай вайны, яны нібы сцвярджаюць, што чалавек не можа і не павінен жыць у адзіноце, што яго ўсё роўна будзе цягнуць да сяброў і паплечнікаў. З імі яму лягчэй, з імі ён робіцца дужым. Гэты чалавек быў на вайне, прайшоў праз усе агні і не азвярэў, а пачаў яшчэ больш любіць жыццё і верыць у светлыя ідэалы будучыні.

Такая, на наш погляд, філасофская канцэпцыя Трэцяй сімфоніі Л. Абеліёвіча.

І на канцэртнай прэм'еры 23 верасня 1967 года, і на паўторных выкананнях мы па рэакцыі слухачоў у філарманічнай зале адчувалі, што пафас гэтага твора зразумелы ўсім.

Вельмі напружана слухаецца, напрыклад, трэцяя частка сімфоніі, дзе па чарзе ўступаюць розныя групы аркестра, уносячы ў агульнае гучанне свой тэмбр і афарбоўку, і ўсе трымаюцца адной эмацыянальнай тэмы: вайна — гора народнае... Музыка, як кажуць, стукае ў грудзі з асаблівай сілай, калі ў ёй з'яўляюцца інтанацыі беларускага меласу.

Пра складаныя сімфанічныя творы часам гавораць, што ў іх не варта шукаць дакладныя жыццёвыя ілюстрацыі да агульнай тэмы. Гэта, відаць, не зусім правільна, ва ўсякім выпадку — спрэчна. Слухаючы Трэцюю сімфонію Л. Абеліёвіча, мы ўсё ж даволі дакладна «чытаем» яе змест, чуем выразныя адрасы эмацыянальных выбухаў і напружанага роздуму сучасніка, які перажыў вайну і пільна прыслухоўваецца да «пульсу часу». Грамадзянская пазіцыя кампазітара ясная і актуальная.

Нам,— першым выканаўцам сімфоніі, прыемна, што гэты твор абмяркоўваецца цяпер сярод тых, якія вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР.

С. АЖЫГІН,
Р. ГЛАЙХЕНГАУЗ,
В. ЗВЕРАЎ,
артысты Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР.

КНІГА ДУШЭЎНАЯ, ЧАЛАВЕЧНАЯ

СПРАВЯДЛІВА сказана: кніга агітуе сама за сябе. Апынуўшыся ў шырокім свеце, яна цяпер ужо не ва ўладзе аўтара — застаецца сам-насам з чытачом.

Зборнік апавяданняў Міхася Стральцова «Сена на асфальце», вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР, адчувае сябе ў чытацкім свеце «ўпэўнена». Я неаднойчы бачыў кнігу ў руках настаўнікаў, журналістаў, студэнтаў, у цішы чытальных залаў бібліятэк, у тлуме рэдакцый і інтэрнатаў, цягнікоў і аўтобусаў.

У зборніку «Сена на асфальце», другім сваім зборніку прозы, М. Стральцоў паўстаў перад намі ў найбольш поўным, найбольш акрэсленым сваім творчым абліччы. З кагорты маладых беларускіх празаікаў М. Стральцова прыкметна вылучае высокая культура мыслення і духоўнага жыцця, навізна стылю, а галоўнае —чуйнасць да праблем і пытанняў, якія турбуюць нашых сучаснікаў, у прыватнасці, маладых сучаснікаў, а сярод іх — найперш маладых інтэлігентаў.

Як прымірыць у душы горад з вёскай? Над гэтым напружана, неадступна думае аспірант Віктар з апавядання «Сена на асфальце». Ён як быццам і зжыўся з горадам, стаў яго стопрацэнтным жыхаром, але вёска, пад шэрымі стрэхамі якой прайшло яго дзяцінства і юнацтва, трывожыць памяць незваротнымі радасцямі далёкіх гадоў і размерана-запаволеным жыццём, месячнымі начамі, звонам летняй касьбы. Віктар — палоннік горада і вёскі.

Праблема псіхалагічнага ўрастання былога вяскоўца ў гарадское асяроддзе адна з асноўных у творчасці М. Стральцова-празаіка. Як бы падкрэсліваючы яе важнасць, ён нават у назву кнігі выносіць: «Сена на асфальце». Праблема гэтая (дзе прыглушана, а дзе больш гучна) закранаецца ў многіх апавяданнях кнігі. Можна нагадаць і апавяданне «Блакітны вецер» з першай кнігі празаіка, у якім ён упершыню загаварыў пра яе.

Увагу М. Стральцова прыцягвае і адваротны бок гэтай з'явы: вяртанне чалавека з горада ў родную вёску (апавяданне «І зноў, зноў горад»). Жыццё вёскі, як і горада — аб'ект уважлівага даследавання пісьменніка. Усім настроем, падтэкстам свайго ёмістага слова М. Стральцоў даводзіць: вёска жыве. Такія людзі, як Максімка («Добрае неба»), дзядзька Ігнат («Сена на асфальце») ёсць і будуць яе жыццёвым коранем, душой і лёсам.

І вёску, і горад пісьменнік ведае не з чужога вопыту. Веданне гэтае праяўляецца ў яго апавяданнях не толькі і не столькі праз дэталі вясковага ці гарадскога пейзажу (дарэчы, які ён па-стральцоўску паэтычны, да ілюзіі рэальны, дакладны ў апавяданнях «Свет Іванавіч, былы донжуан», «Добрае неба», «Сена на асфальце» і інш.), а, галоўным чынам, праз псіхічны і разумовы склад сучасніка — усё роўна, гараджанін ён ці вясковец.

Пісьменнік слыхам і зрокам засяроджаны на нашым часе, на яго шматгалосых і зменлівых прылівах і адлівах. А слых і позірк у пісьменніка чуйны і праніклівы: ён не слізгае па паверхні з'яў, а даходзіць да іх сутнасці.

Тут я не магу не ўспомніць апавядання «Свет Іванавіч, былы донжуан». Смела, бескампрамісна расказвае нам пісьменнік пра духоўны і жыццёвы крызіс свайго героя. Яму бракуе душэўнай цэльнасці. Але, адольваючы сумненні і трывогі, ён ідзе да яе. Тупік, у які трапіў герой, не безнадзейны. Ён чэсны перад сабой і перад іншымі. Ні піжонам-хлюстам, што цугам валочацца па вуліцах, не ведаючы, як зглуміць час, ні мяшчанам накшталт таксіста, не зразумець яго: ён на галаву вышэй іх актыўным унутраным жыццём.

Напружаны і імклівы рытм сучаснага жыцця. Чалавек нашага веку сталее рана. І часам, вырваўшыся з турбот дня, у цішы душы вяртаецца да сваіх жыццёвых вытокаў: каб ісці далей, яму трэба зразумець сябе, свой час.

М. Стральцоў бачыць, разумее гэта. Ён прылучае нас да маленства сваіх герояў — паэтычнага, чыстага, непасрэднага. Святло чалавечага дзяцінства саграе амаль усе творы пісьменніка. Яно і наша маленства. Горкае і цяжкае, бо праз яго прайшла вайна.

Між іншым, у М. Стральцова мы нідзе не сустракаем непасрэднага расказу пра вайну. Але вайну з яе смяротным холадам мы адчуваем — ці то праз карціну галоднага жыцця вясковага хлапчука («На чацвёртым годзе вайны»), ці праз успамін, ці праз якую-небудзь адну выразную дэталь (напрыклад, страхатлівы піск сініцы ў навеле «Трывожна крычыць птушка»). Неспакойны наш век. Пытанне вайны і міру застаецца адкрытым. І гэтую трывогу веку востра адчуваюць героі пісьменніка (для прыкладу, герой апавядання «Там, дзе зацішак, спакой»).

Поспех твораў М. Стральцова — не ў адной толькі вострыні і надзённасці праблем і пытанняў. Поспех гэты — у мастацкай рэалізацыі іх. Адпаведна матэрыялу рэчаіснасці празаік заўсёды знаходзіць і мастацкую форму: дакладную кампазіцыю, настрой, інтанацыю і г. д.

У зборніку «Сена на асфальце» мы знаходзім і кароткую навелу, і імпрэсію, і апавяданне складанай пабудовы. У творчых пошуках М. Стральцоў імкнецца да максімальнай сціпласці твора і адначасова да найбольшай жыццёвай напоўненасці яго. Дастаткова прыгадаць апавяданне «Сена на асфальце». Тут і дзядзька Ігнат са сваім характарам, лёсам і клопатам, і аспірант Віктар са сваім роздумам, са сваімі думкамі пра сяброўку, пра футбол, са сваім неаслабным імкненнем прымірыць у душы горад і вёску, і Лена са сваімі дзявочымі турботамі і марамі. І ўсё гэта — на адносна невялікай, кампактнай плошчы.

Душэўныя, чалавечыя творы ў М. Стральцова. Усё, пра што ён піша, дорага і блізка яму. Не эфектна закручаным сюжэтам вабяць яны нас (сюжэта ў звычайным разуменні гэтага слова няма — ёсць шырокая думка, якая развіваецца ў творы і якая, зрэшты, арганізоўвае жыццёвы сюжэт), а складанай праўдай жыцця, багаццем духоўнага зместу сучасніка.

...Кніга М. Стральцова «Сена на асфальце» — не для лёгкага «чтива». Складаны наш час, складаны наш чалавек — складаныя і творы пісьменніка. Але яны надзейна робяць сваю справу: чыстым, нібы прамытым у крыніцы, словам духоўна і інтэлектуальна ўзбагачаюць чытача.

М. ВЫШЫНСКІ.

СВЕТ РОДНАЙ ПРЫРОДЫ

У пачатку аповесці «Жоўтая акацыя» Ул. Дубоўка прыгадвае сваё маленства:

«Як толькі я сябе помню, бацькі мае і старэйшыя людзі-суседзі прывучалі нас, малых, шанаваць усё жывое, што было навокал нас.

— Не тапчы травіцу, хадзі сцежачкай. Травіца вырасце. Яе скосяць — будзе сена кароўкам, каню...

— Не чапай, не ламай гэтага дубчыка або сасёнкі...

— Асцярожна рві яблыкі — не паламай, не адвіхні галінку. Дрэва будзе хварэць, на паломаным суку не будзе яблыкаў...

Як толькі я сябе помню, штодня даводзілася пачуць нешта новае і цікавае.

— Гэтая зёлка — дзівасіл. Калі выкапаць і пасушыць ягонае карэнне — будзе зелле ад болю ў грудзях...

— Гэтая прыгожая красачка — валошка, або васілёк. Калі яе пасушыць, будзе зелле ад хваробы вачэй, яно дапаможа, каб вочы яснейшыя былі...

З таго менавіта часу расло ў мяне вялікае замілаванне да прыроды».

І вось пісьменнік узяўся расказаць дзецям пра дрэвы і травы, пра зёлкі і краскі роднай зямлі, каб перадаць малодшаму пакаленню сваю замілаванасць, прывіць любоў і павагу да роднай прыроды.

Пры кожнай нагодзе (а пісьменнік умее знаходзіць повады) перад намі разгортваюцца ўсё новыя, нязнаныя старонкі з жыцця прыроды. Зойдзе гаворка пра трыпутнік (повад — вучаніца парэзала руку), і пісьменнік раскажа пра цудадзейныя лекавыя якасці трыпутніка, растлумачыць іх з хімічнага боку, прыгадае народныя прыказкі і прымхі, успомніць верш Васіля Віткі...

У кнізе, дарэчы, багата цікавых выказванняў вучоных і грамадскіх дзеячоў, цытат з твораў паэтаў і пісьменнікаў, прыказак і прымавак, урыўкаў з народных песень. Я. Колас, Я. Купала, П. Броўка, М. Танк, М. Лужанін, П. Панчанка, В. Вітка, А. Русецкі, А. Бялевіч, А. Астрэйка і многія іншыя нашы паэты — «сааўтары» гэтай кнігі: іх вершы не аднойчы цытуюцца ў аповесці.

Пісьменнік выкарыстоўвае скарбы народнай мудрасці і дадзеныя сучаснай навукі. Мы даведваемся з кнігі пра шляхі, па якіх ішло пераўтварэнне прыроды чалавекам, становімся сведкамі пошукаў вучоных-селекцыянераў, набываем арыенціроўку ў назвах і ўласцівасцях беларускіх траў.

У аповесці «Жоўтая акацыя» апісаны справы аднаго гуртка юных натуралістаў. Ул. Дубоўка з прыязнай усмешкай расказвае пра справы няўрымслівых юннатаў Адама, Амброжа, Гіляра, Зосі і іншых школьнікаў, якія пад кіраўніцтвам настаўнікаў Сымона Васільевіча і Ніны Іванаўны праводзяць на прышкольным участку цікавыя доследы з жоўтай акацыяй, з вадзянымі арэхамі, з прышчэпкай кедра на сасну.

Пэўна, не ўсе героі аповесці стануць біёлагамі, аграномамі, селекцыянерамі. Але шанаваць родную прыроду яны несумненна будуць заўсёды. А разам з імі і тыя, хто прачытаў аповесць «Жоўтая акацыя», — бо і яны прымуць у сэрца любасць пісьменніка да роднай зямлі, яе лясоў і палёў, да паэзіі беларускіх казак, паданняў, песень, вершаў, у якія ўвасобілася любоў народа да свайго краю...

Васіль МЯЦЕЖ,
стараста гуртка юннатаў Прылуцкай школы Мінскага раёна.

Л. ГУМІЛЕЎСКІ. Трыпціх «Партызаны».

УСЕСАЮЗНЫ ФЕСТЫВАЛЬ ЭСТРАДНАГА МАСТАЦТВА

МАРШРУТЫ ВЯСЁЛЫХ СУСТРЭЧ

Пасля аднаго з канцэртаў Махмуд Эсамбаеў дае аўтографы магілёўчанам. Фота А. ГОЛЬША.

Па ўсёй рэспубліцы пралеглі маршруты ўдзельнікаў Усесаюзнага фестываля эстраднага мастацтва. Фестывальныя канцэрты праходзяць у гарадах і вёсках, дамах культуры заводаў і фабрык, у канцэртных залах. Лепшыя майстры савецкай эстрады выступаюць па радыё і тэлебачанню.

Так, сваю цікавую, захапляючую праграму паказаў па Беларускаму тэлебачанню эстрадны аркестр з Малдавіі «Букрыя». Госці з Азербайджана — Дзяржаўны эстрадны аркестр гэтай рэспублікі — з поспехам выступілі перад віцяблянамі, а на другі дзень далі канцэрт у Оршы.

Некаторыя калектывы (напрыклад, эстрадная група з удзелам Барыса Брунова) ужо закончылі выступленні ў нашай рэспубліцы. Другія ж толькі ўключыліся ў фестываль. Ужо дала некалькі канцэртаў у Жлобіне і Рагачове эстрадная група Росканцэрта пад кіраўніцтвам дыпламанта Усерасійскага конкурсу артыстаў эстрады Э. Жэрдзевай. Выступіў перад гледачамі Брэста яшчэ адзін «навасёл» фестываля — эстрадны ансамбль Грузінскай філармоніі «Дзіело». А ў гэты час землякі «Дзіело», эстрадны аркестр «Чангі», разам са сваёй славутай салісткай лаўрэаткай прашлагодняга Сопацкага фестываля Гюлі Чахелі з поспехам выступалі ў Мінску. Гюлі як бы перадала эстафету другому ўдзельніку Сопацкага фестываля — беларускаму спеваку Віктару Вуячычу. Учора ён выступіў у канцэртнай зале сталічнай філармоніі з сольным канцэртам.

У Мінску выступаў і аркестр з Прыбалтыкі — РЭА пад кіраўніцтвам Раймонда Паулса. А ўчора рыжскіх артыстаў з задавальненнем прымалі жыхары Бабруйска. Яшчэ адзін прыбалтыйскі калектыў — эстонскі ансамбль «Лайнэ» — выступіў у Лідзе. Вакальна-інструментальны ансамбль «Мрыя» з Кіева быў цёпла сустрэты ў Магілёве і Оршы, а заслужаны артыст Абхазскай АССР Гарольд Пірцхалава —ў Наваполацку і Віцебску. Народнай артыстцы РСФСР Клаўдзіі Іванаўне Шульжэнка горача апладзіравалі ў Жодзіна. А майстру арыгінальнага жанру Аруцюну Акапяну, лаўрэату многіх міжнародных конкурсаў, дасталося многа ўсмешак і кветак ад працоўных Баранавіч.

Апошнія сонечныя дні жніўня ў Беларусі, акрамя ўсяго, яшчэ і адзначаны вясёлымі сустрэчамі гледачоў з майстрамі эстрады. Гэтыя сустрэчы пяройдуць і ў пачатак верасня.

РАЙМОНД ПАУЛС ВЕРЫЦЬ У ДЖАЗ

— Негрыцянскі кампазітар Дзюк Элінгтон. Караван. Саліст — заслужаны дзеяч мастацтваў Латвійскай ССР Раймонд Паулс, — аб'явіла Генавева Скангале — канферансье Рыжскага эстраднага аркестра. А за раялем ужо сядзеў невысокі хударлявы чалавек і ледзь чутна перабіраў клавішы. Мелодыя станавілася ўсё больш выразнай, яна ўжо запоўніла ўсю залу і, здавалася, старалася пранікнуць цяпер у самае сэрца слухачоў. Яна то клалася ў каляіну, пракладзеную для яе кампазітарам, то адыходзіла ўбок, каб, нечакана ўзляцеўшы, зноў уліцца ў гэтую каляіну. Мелодыя жыла сваім адасобленым жыццём, і валодаць гэтым жыццём меў права толькі адзін чалавек, які сядзеў за раялем. Паулс як быццам нанава чытаў тое, што было напісана негрыцянскім кампазітарам і трубачом. Чытаў з захапленнем, забыўшыся на ўсё на свеце. Так можа чытаць толькі чалавек, які адчувае музыку ўсім сэрцам.

У гэты вечар аркестр Раймонда Паулса іграў у Палацы культуры трактарнага завода. Гэта быў цікавы эстрадны канцэрт, у якім гледачам, відаць, спадабалася ўсё. У Рыжскім эстрадным аркестры працуюць выдатныя салісты, такія як Салі Ландау, Ояр Грынберг, Маргарыта Вілданэ, Здзіслаў Раманоўскі, —спевакі маладыя, але ўжо дастаткова вядомыя і ў сябе ў рэспубліцы, і за яе межамі. Спяваюць яны лёгка і неназойліва, з традыцыйнай, я сказаў бы, стрыманасцю прыбалтаў. Добры вакальны ансамбль! Ён цудоўна «ўпісваецца» ў аркестр, становіцца яго часткай. З РЭА працуе выдатны музычны кіраўнік — Алніс Закіс, бліскучы скрыпач-імправізатар (дарэчы, ён вельмі пераканальна гэта даказвае, выконваючы імправізацыю на тэму старажытнага рускага раманса).

Але ўсё-такі самым яркім абліччам аркестра з'яўляецца, на мой погляд, яго мастацкі кіраўнік — заслужаны дзеяч мастацтваў Латвійскай ССР Раймонд Паулс. Яго музыка, яго манера ігры і дырыжыравання ў нейкай меры вызначаюць манеру і аблічча ўсяго калектыву. Паулс — музыкант надзвычай адданы джазу, а РЭА — гэта джаз-аркестр, створаны хутчэй для сольных выступленняў, чым для акампанемента салістам (трэба сказаць, што і тое і другое ён робіць з бляскам). Яны на дзіва падыходзяць адзін аднаму — аркестр і яго мастацкі кіраўнік. Расказваць пра аркестр—гэта значыць расказваць пра Паулса, расказваць пра Паулса—гэта значыць расказваць пра РЭА.

Раймонд Паулс — кампазітар, піяніст, дырыжор і аранжыроўшчык джаза, вядомы ў савецкім эстрадным мастацтве. Гэта артыст, самабытны музыкант, які з аднолькавым поспехам працуе і ў вялікім аркестры, і ў джазавым трыо; піша лёгкія эстрадныя песні і вялікія аркестравыя творы; апрацоўвае джазавую класіку і народную музыку. А яго манера дырыжыравання такая, што падначальвае сабе не толькі аркестр, але і аўдыторыю. Ён умее захапіць слухача джазам і прымусіць перажываць самыя тонкія нюансы джазавай кампазіцыі.

Думаецца, што чалавеку, які любіць джаз, цікава пазнаёміцца з Раймондам бліжэй, чым звычайна слухач знаёмы з выканаўцам. Фестываль прадаставіў нам гэтую магчымасць. І вось кіраўнік Рыжскага эстраднага аркестра, кампазітар Раймонд Паулс адказвае на пытанні «ЛІМа»...

— Раскажыце, калі ласка, крыху пра РЭА.

— Рыжскі эстрадны аркестр існуе ўжо адзінаццаць гадоў. Сёння ў ім засталося толькі два чалавекі са старога складу. Вядома, за гэтыя гады РЭА даў сотні канцэртаў, паспеў аб'ездзіць усю краіну, пабываў за рубяжом — у Венгрыі, ГДР. Зараз наш аркестр рыхтуецца да паездкі ў Фінляндыю, дзе будзе ўдзельнікам Тыдня латвійскай культуры.

— Ці змяняўся інструментальны склад аркестра?

— Так, вядома. Некалькі гадоў назад у нас была струнная група. Сёння, як бачыце, яе няма. Затое з'явіўся вакальны ансамбль. Аркестр стаў больш кампактны, больш джазавы, ці што. Відаць і далей гэтыя змены будуць працягвацца. Бо джаз не стаіць на месцы.

— А ці даўно вы працуеце ў аркестры?

— Усе адзінаццаць гадоў. Спачатку быў піяністам, цяпер — мастацкім кіраўніком. Хоць і сёння з задавальненнем саліраю ў аркестры на фартэпіяна.

— Некалькі гадоў назад з'явілася джаз-трыо, якое стала вядома ў джазавым свеце, як «трыо Раймонда Паулса». Ці існуе яно сёння?

— На жаль, не. Ігра ў трыо патрабуе ўпартай работы, а часу для гэтага не хапае. Я сур'ёзна заняўся кампазіцыяй. Калі мы і іграем іншы раз утраіх, дык хутчэй для сябе, для адпачынку.

— У якіх джазавых конкурсах і фестывалях вы ўдзельнічалі?

— Ніколі ў іх не ўдзельнічаў! Бачу, вы здзіўляецеся... Справа ў тым, што я лічу сябе недастаткова падрыхтаваным для такіх фестываляў. У джазе трэба сур'ёзна працаваць, трэба займацца толькі выканаўчай дзейнасцю. Тады можна стаць музыкантам вышэйшага класа, калі ты, вядома, іграеш душой, сэрцам, а не голай тэхнікай.

— Раймонд, вы прадстаўнік латвійскага джаза, вельмі папулярнага ў нашай краіне. Скажыце, ці існуе ў Латвіі свая нацыянальная джазавая школа?

— Пра нацыянальныя школы джазу ў апошні час вельмі многа гавораць. Але мне здаецца, што пакуль нацыянальнага джаза ў нас няма. І не толькі ў Прыбалтыцы. Мы яшчэ стаім на шляху пераймання. Я, напрыклад, не бачу розніцы паміж тым, як іграюць армянскі і нямецкі аркестры. А армянская ж народная музыка надзвычай рытмічная, яна як бы створана для апрацоўкі. Ёсць і ў нас, канечне, таленавітыя музыканты і аркестры, якія спрабуюць знайсці свой шлях. Але гэта пакуль яшчэ толькі пачатак.

— Ці спрабуе РЭА знайсці сваё аблічча?

— Так, вядома. Мы спрабуем стварыць свой, уласны рэпертуар. Напрыклад, нядаўна наш аркестр выступіў у Рызе з сольным джазавым канцэртам. Першае аддзяленне было прысвечана творам латвійскіх кампазітараў (у прыватнасці, выконвалася мая сюіта ў пяці частках «Джазавая экспрэсія»). Другое аддзяленне — класіка сусветнага джаза: Гершвін, Армстронг, Элінгтон. Відаць, стварыўшы свой рэпертуар, можна знайсці і сваё аблічча.

— Раймонд, вы, відаць, заўважылі, што ў апошні час на канцэрты джаз-аркестра ходзіць не так ужо многа слухачоў. Чым гэта тлумачыцца?

— Наўрад ці ўсе праблемы лёгкай джазавай музыкі можа творча вырашыць які-небудзь адзін калектыў. Наш аркестр— у пошуках. І тут нам карысна ведаць вопыт шматлікіх і розных эстрадных аркестраў: штосьці пераасэнсоўваць, штосьці браць за прыклад. Таму мы і не робім канчатковых высноў у размовах пра мастацтва джаза і пазбягаем катэгарычнасці ў ацэнках сваёй і чужой дзейнасці... Сапраўднаму традыцыйнаму джазу вельмі перашкаджае мода. Напрыклад, «біг-біт». Яна адцягвае моладзь, і гэта, паверце, вельмі крыўдна.

— Але ж мода праходзіць.

— З'явіцца іншая. Не важна, будзе яна доўгавалосая, як бітлы, або зусім без валасоў. Але яна абавязкова з'явіцца. Такі ўжо рытм нашага сучаснага жыцця. Дарэчы, вы заўважылі, што ў апошні час па радыё можна ўсё часцей пачуць старыя вальсы і танга? Людзі стаміліся ад механічнага рытму «біг-біта» і таму кідаюцца ў іншую крайнасць... І ўсё ж я веру, што сапраўднае мастацтва, сапраўдны джаз пераможа. Інакш я не быў бы джазавым музыкантам.

— Што ж, чытачы «ЛІМа» жадаюць вам поспеху. Сапраўдны джаз пераможа. І тады яшчэ ярчэй загучыць РЭА — аркестр Раймонда Паулса.

Барыс ГЕРСТАН.

Выступае саліст Рыжскага эстраднага аркестра Ояр Грынберг. Фота Ул. КРУКА.

50 ТЫСЯЧ АРТЫСТАЎ-АМАТАРАЎ

На ўсіх прадпрыемствах, ва ўстановах, у калгасах і саўгасах Мінскай вобласці заканчваюцца агляды мастацкай самадзейнасці, прысвечаныя 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Абласны аргкамітэт падвёў вынікі гэтых аглядаў. На пасяджэнні былі заслуханы даклады старшынь аргкамітэтаў г. Барысава, а таксама Барысаўскага, Вілейскага і Лагойскага раёнаў.

Аргкамітэт адзначыў поспехі ў развіцці мастацкай самадзейнасці гэтых раёнаў. У Барысаве, напрыклад, значна палепшылася мастацкае абслугоўванне працаўнікоў горада і вёскі сіламі самадзейных калектываў. Народны тэатр заканчвае работу над новым спектаклем «Бацькаўшчына» К. Чорнага. Новую цікавую праграму падрыхтавалі музычныя і танцавальныя калектывы гарадскога Дома культуры, цымбальны аркестр фабрыкі піяніна. Тэатр мініяцюр рыхтуе спектакль па сцэнарыі, які напісаў заслужаны артыст БССР М. Зорын.

У рэпертуары шматлікіх творчых калектываў, разнастайных па жанрах і стылях, якія выступілі ў справаздачных канцэртах, пераважалі творы аб Радзіме, Леніне, партыі, роднай Беларусі. Звыш 50 тысяч артыстаў-аматараў вобласці ўдзельнічалі ў мясцовых аглядах.

Адзначаліся і недахопы. Сур'ёзныя заўвагі зроблены ў адрас Барысаўскага, Вілейскага і Лагойскага аргкамітэтаў, якія не наладзілі як след кіраўніцтва мясцовымі аглядамі мастацкай самадзейнасці.

Аргкамітэт разгледзеў план мерапрыемстваў абласнога Дома народнай творчасці, у якім прадугледжваецца шырокая дапамога творчых сіл беларускай сталіцы самадзейным калектывам Міншчыны. Зацверджан графік справаздачных канцэртаў гарадоў і раёнаў на занальных аглядах у Слуцку, Барысаве, Дзяржынску, Чэрвені і Маладзечна. Заключны канцэрт абласнога агляду адбудзецца ў Мінску 30 лістапада.

ТВОРЧЫ СЕМІНАР У ЛІТВЕ

У Вільнюсе праходзіць нарада-семінар мастакоў тэлебачання еўрапейскай часткі Саюза ССР. Мастакі Калінінградскай, Кіеўскай, Мінскай, Мурманскай, Рыжскай, Талінскай тэлестудый абменьваюцца думкамі па пытаннях эстэтыкі блакітнага экрана.

Вялікая і цікавая праграма работы гэтай нарады-семінара. Мастакі братняй Літвы падрыхтавалі багата ілюстраваныя даклады аб сучасным інтэр'еры, аб выкарыстанні мастацкай фатаграфіі ў тэлебачанні, аб графічным афармленні перадач.

У гэтай нарадзе ўдзельнічаюць мастакі Мінскай студыі тэлебачання В. Казлоў, М. Карпук і Ус. Палецкіс. Больш сарака работ беларускіх мастакоў, якія прымалі ўдзел у афармленні тэлеперадач, прадстаўлены ў Вільнюсе. Тут эскізы тэлепастановак і касцюмаў, розныя застаўкі—цітравыя, мультыплікацыйныя. Удзельнікі нарады-семінара змогуць пазнаёміцца з асобнымі канцэртнымі нумарамі Мінскай студыі тэлебачання, знятымі на плёнку. Прывезены ў сталіцу Літвы дзве часткі тэлефільма «Крах» і інш.

Да нарады адкрылася выстаўка работ мастакоў тэлестудый еўрапейскай часткі СССР.

Удзельнікі нарады-семінара пабываюць у карціннай галерэі і музеі Чурлёніса, наведаюць майстэрні літоўскіх мастакоў. Нарада-семінар працягнецца да другога верасня.

ХТО ТКАЎ «ЧЭСМЕНСКІ» ДЫВАН?

У Екацярынінскім палацы-музеі ў Пушкіне пад Ленінградам ёсць зала, прысвечаная перамогам рускіх войскаў над турэцкімі ў войнах канца XVIII стагоддзя. Сярод іншых экспанатаў — славуты дыван, які завуць «Чэсменскім».

Дыван — вялізны. Плошча яго — 40 квадратных метраў. У цэнтры дывана на светлым фоне медальёна вытканы арол з распасцёртымі крыламі. Па баках — кампазіцыя ў выглядзе перапляцення рускіх сцягоў з рознымі ваеннымі даспехамі. А па кутах сярод батальных атрыбутаў — рогі багацця.

Хто ж стварыў цудоўны дыван? Меркавалася, што Екацярына II заказала яго за мяжой, каб падараваць свайму фаварыту — графу Аляксею Арлову, які атрымаў тытул Чэсменскага за перамогу рускага флоту. Версія аб замежным паходжанні дывана абгрунтоўвалася тым, што ў XVII—XVIII стагоддзях французскія ткачы дасягнулі вялікага майстэрства ў вытворчасці такіх вырабаў, якія ва ўсёй Еўропе былі вядомыя пад назвай «Саванеры». Але такіх дакументаў, якія пацвярджалі б французскае паходжанне дывана, няма.

Устанавіць ісціну было даручана маладому навуковаму супрацоўніку Екацярынінскага палаца-музея Яўгеніі Ямшчыковай.

Пасля працяглых і карпатлівых пошукаў у адной з літаратурных крыніц быў знойдзены «Даклад члена саматужнага Савета Маскоўскага губернскага земства графа П. С. Шарамецьева». У дакуменце даваўся агляд развіцця мастацкіх промыслаў у Маскоўскай губерні. У ім цытавалася пісьмо Екацярыны II ад 12 студзеня 1795 года, адрасаванае графу Аляксею Арлову-Чэсменскаму: «Дзякую Вас за віншаванне мяне з перамогай... Дзякую таксама за прысылку дывана і ва ўзнагароду тым, хто працаваў над ім, пасылаю на падзел тысячу рублёў». Каменціруючы пісьмо, Шарамецьеў прыходзіць да вываду, што дыван вытканы ў вотчыне графа Чэсменскага.

Ямшчыковай удалося знайсці таксама доказы таго, што «Чэсменскі» дыван быў вытканы майстрамі дома Хітраво.

Амаль два стагоддзі аддзяляюць нас ад таго часу, але і па сённяшні(?) стаіць у Маскве будынак, які ў мінулым называўся домам Хітраво. Знаходзіцца ён на вуліцы Герцэна, 5, былой Вялікай Нікіцкай. Тут размяшчаецца цяпер гістарычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта.

Яўгенія Ямшчыкова высветліла, што ў XVII стагоддзі гэта былі палаты баярына Багдана Хітраво. З 1765 года дом належаў Уладзіміру Арлову — малодшаму брату Аляксея Арлова-Чэсменскага. Але па звычцы будынак працягвалі называць «домам Хітраво». Тут, у графскай вотчыне, працавалі многія майстры розных спецыяльнасцей. Ім Аляксей Арлоў і заказаў дыван для імператрыцы.

Такім чынам, цудоўны твор мастацкага рамяства — «Чэсменскі» дыван — створаны рускімі ўмельцамі.

Пры Екацярыне II дыван знаходзіўся ў Зімнім палацы ў Санкт-Пецярбурзе. Мяркуецца, што пасля смерці імператрыцы ў 1796 годзе ён быў перададзены ў Мармуровы палац, які належаў вялікаму князю Канстанціну Паўлавічу. Па крайняй меры ў 1922 годзе дыван перавезлі ў Царскае Сяло менавіта з Мармуровага палаца.

Але даследаванне яшчэ не завершана. Трэба яшчэ ўстанавіць імёны таленавітых прыгонных майстроў, якія працавалі над выкананнем графскага заказу для падарунка «яе Вялікасці».

Аркадзь ЯКАЎЛЕЎ. (АДН).

Кастарэзы Уэлена

На самым усходнім краі Расіі — у пасёлку Уэлен — жывуць і працуюць таленавітыя умельцы, майстры мастацкай разьбы па косці. Тут размясцілася славутая кастарэзная майстэрня «Паўночныя сувеніры».

З-пад разца майстроў выходзяць, нібы жывыя, фігуркі жывёлін, цэлыя скульптурныя групы, разныя арнаменты на косці, каляровыя гравюры. Матэрыялам служыць маржовы клык, а тэмы кастарэзы чэрпаюць з наваколь най рэчаіснасці. У прыгожых творах нацыянальнага мастацтва адчуваецца суровае дыханне тундры, шум мора, у іх адлюстравана мінулае і сучаснае Чукоткі, працоўныя будні паляўнічых і аленяводаў, яркія сцэнкі з жыцця жывёл.

Старажытнае кастарэзнае майстэрства эскімосаў і чукчаў перадавалася з роду ў род, з пакалення ў пакаленне. а сапраўднае майстэрства прыходзіла з гадамі. Увесь свет сёння ведае славутых уэленскіх кастарэзаў Вуквутагіна Хухутана, Тукая, Янку. Іх шэдэўры бачылі Парыж, Токіо, Брусель, Берлін, Манрэаль.

Майстры чароўнага разца ствараюць зараз новыя творы і навучаюць свайму майстэрству моладзь. Дванаццаць хлопчыкаў-чукчаў займаюцца ў кастарэзным гуртку, але прыходзіць сюды на заняткі можа кожны, у каго ёсць жаданне і здольнасці. Амаль усе юныя настарэзы—дзеці аленяводаў. Лета яны праводзяць у тундры, ля мора, ходзяць з дарослымі на паляванне, дапамагаюць пасвіць статкі аленяў.

Дзеці тундры імкнуцца расказаць мовай мастацтва аб усім цікавым, што ім давялося ўбачыць. Вучань пятага класа Герман Эйняўтэгін і пастух Тальо сутыкнуліся твар у твар з двума мядзведзямі. Зброі ў хлопчыкаў не было. Тальо не разгубіўся, стаў стукаць лязом нажа аб партсігар і пайшоў на мядзведзяў. Касалапыя спалохаліся незразумелых гукаў і ўцяклі. Эйняўтэгіну хочацца сваім мастацтвам расказаць аб смеласці сябра.

Валерый Рэкен таксама пяцікласнік. Яго бацька паляўнічы і часта бярэ з сабой сына, калі едзе прамышляць нерпу ў таросы Ледавітага акіяна. Сцэнкі палявання Рэкен намаляваў на паперы і цяпер гэтыя задумы яму хочацца ўвасобіць у косці.

У Толі Таекергінта, Віці Кеўкай, Мішы Тыркінта свае планы. Ці здолеюць хлопчыкі справіцца з задачамі, якія яны самі сабе паставілі?

Прыйдзе час, змогуць. А зараз ім патрэбна надзейная рука майстра, вопыт. Заняткі ў школьным гуртку вядзе вопытны настарэз Андрэй Тышоў. Вучні цярпліва авалодваюць цяжкім мастацтвам. Іх рук ужо слухаецца бормашына, разец. Хлопчыкі спрытна выразаюць з маржовага ікла фігуркі белых мядзведзяў, нерпаў, маржоў, аленяў.

Амаль штодзень пяцікласнікі заходзяць у кастарэзную майстэрню і, затаіўшы дыханне, назіраюць, як працуюць прызнаныя майстры. Чародкай збіраюцца каля заслужанага мастака РСФСР Хухутана і становяцца сведкамі нараджэння сапраўдных твораў мастацтва. Каля гравёра Галіны Тынатваль таксама заўсёды гледачы. Будучыя кастарэзы сочаць за яе работай: глядзяць, як з'яўляюцца яркія малюнкі сабачых упражак, самалётаў, усюдыходаў, суднаў.

Сёння гуртон і простая фігурка звера — забава для хлопчыкаў, а заўтра, зусім пэўна, дзеці паляўнічых і пастухоў стануць аўтарамі уэленскіх шэдэўраў.

Барыс КАРАБЕЙНІКАЎ, (АДН).

Вераснёўскі ЭКРАН

«ПА РУСІ»

Гэта шырокаэкранная мастацкая кінакарціна створана рэжысёрам Фёдарам Філіпавым на студыі «Масфільм» па сцэнарыі Аляксея Сімукова. Яна расказвае пра вандраванні па Русі маладога Алёшы Пешкава, ролю якога выконвае акцёр Маскоўскага тэатра імя Пушкіна Аляксей Лонцаў, добра знаёмы гледачам па кінастужках «Бывайце, галубы!», «Я крочу па Маскве», «Першы снег», «Наш дом», «Тунель».

У ролі Алёшы Пешкава артыст Аляксей Лонцаў.

«ЗОРКІ І САЛДАТЫ»

Кадр з фільма «Зоркі і салдаты».

— Наша новая кінастужка, — гаворыць рэжысёр-пастаноўшчык Міклаш Янча,—расказвае аб салідарнасці і адзінстве сусветнага пралетарыяту ў барацьбе за свае правы, аб тым, як у бітвах з белагвардзейцамі плячо ў плячо з рускімі змагаліся венгры, немцы, аўстрыйцы, чэхі.

Галоўныя ролі ў фільме выконваюць: Лізаветы — артыстка Таццяна Конюхава, Вольгі — Крыстына Мікалаеўска, Андраша — Цібар Мольнар, Іштвана — Ежаф Мадараш, Ласла — Андраш Козак, матроса — Віктар Аўдзюшка, казака — Сяргей Ніканенка, палкоўніка — Глеб Стрыжэнаў, капелеўскага афіцэра — Мікіта Міхалкоў, Спірыдонава — Міхаіл Казакоў.

Фільм «Зоркі і салдаты» — сумесная вытворчасць кінастудый «Масфільм» (СССР) і «Мафільм» (Венгрыя). Аўтар сцэнарыя — Георгій Мдзівані.

«БЕЗ ПРАВА БЫЦЬ САБОЙ»



Так называецца першая серыя новага шырокаэкраннага мастацкага фільма «Шчыт і меч», які здымаўся на студыі «Масфільм» па матывах аднайменнага рамана Вадзіма Кажэўнікава (рэжысёр У. Басаў).

Галоўную ролю Бялова-Вайса іграе акцёр Маскоўскага тэатра драмы і камедыі Станіслаў Любшын. У яго творчым актыве — некалькі акцёрскіх работ у фільмах «Мне дваццаць гадоў», «Вялікая руда», «Альпійская балада» і іншых.

Станіслаў Любшын у ролі Бялова-Вайса.

«АД СНЕГУ ДА СНЕГУ»

У ролі маладога метэаролага Ані Сямёнавай—студэнтка Ленінградскага механічнага інстытута Надзея Раманіна.

Карціна здымалася на Адэскай кінастудыі рэжысёрам Юрыем Пятровым па сцэнарыі Анатолія Пралоўскага.

У гэтым фільме няма вострых сюжэтных паваротаў. Уважліва і непаспешліва аўтары карціны расказваюць аб тым, як канчаецца маленства і чалавек становіцца дарослым, як кожны па-свойму адкрывае свет.

У ролі галоўнай гераіні кінааповядання — маладога метэаролага Ані Сямёнавай дэбютавала студэнтка Ленінградскага механічнага інстытута Надзежда Раманіна.

□ □ □

У верасні на экранах рэспублікі будуць дэманстравацца таксама мастацкія кінааповесці «Зайдзі ў мой дом» і «Вяртанне ўсмешкі».

З зарубежных стужак гледачы ўбачаць «Пах міндалю» (Балгарыя), «Дыялог» (Венгрыя), «Ты — маё жыццё» (Індыя), «Залатая куля» (Італія), «Чорвен і мюзак» (Швецыя), «Вялікая белая вежа» (Японія).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

30 жніўня

Першая праграма. 17-00 — «Навіны». 17-10 — праграма перадач. 17-15 — творчае аб'яднанне прыгод і фантастыкі. Е. Вайскунскі, І. Лукадзьянаў. «Формула немагчымага» (М). 18-00 — насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Тэхніка другога паўвеку». Аб прымяненні новых палімерных матэрыялаў. 18-30 — «Кнот». Сатырычны часопіс. 18-40 — «5+2». Штотыднёвы агляд. 19-10 — дзіцячы экран. «Сланяня». Мультыплікацыйны фільм. 19-20 — «Народны кантроль». Тэлевізійны часопіс. 20-05 — «Дзверы». Кароткаметражны фільм. 20-15 — «Эстафета навін» (М). 21-15 — «На агеньчык» (М). 22-30 — праграма каляровага тэлебачання. Тэлевізійны тэатр мініяцюр «Трынаццаць крэслаў» (М). 23-30 — «Толькі факты». Праграма перадач. «На сон надыходзячы». Музычная праграма.

Другая праграма. 10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — для школьнікаў «Прыходзь, казка» (М). 10-30 — для дзяцей. «Барбос у гасцях у Бобіка». Мастацкі фільм (М). 11-00 — «Горад спявае». Перадача з Сочы. 11-45 — для школьнікаў. «Вецер вандраванняў» (М). 12-15 — «Табе, юнацтва!» Перадача з Краснадара. 18-00 —для школьнікаў. «Незвычайны лагер» (М). 18-55 — «Інтэрв'ю, якога не было». Прэм'ера тэлевізійнага музычнага фільма (М). 20-15 — па роднай краіне. «Сустрэча з прыгожым». Кінанарыс.

31 жніўня

Першая праграма. 8-55 — праграма перадач. 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45 — тэлевізійныя навіны (М). 10-00 — «З днём нараджэння!» (М). 10-30 — «Суботні рэпартаж» (М). 11-00 — «Веды» (М). 12-15 — «Здароўе» (М). 12-45 — «Музычная шкатулка». 13-05 — для дзяцей. «З новым навучальным!» Выступленне намесніка міністра асветы БССР Г. І. Канцавой і заслужанай настаўніцы БССР Героя Сацыялістычнай Працы А. І. Казей. 13-20 — для дзяцей. «Хлопчык з Уржума». Кінанарыс. 13-40 — «Трэці семестр». Пра студэнцкія будаўнічыя атрады. 14-00 — «Турнір дапытлівых». 14-40 — для дзяцей. «Каліф-бусел». Прэм'ера тэлевізійнага фільма (М). 16-00 — «Свет сацыялізма» (М). 16-30 — праграма каляровага тэлебачання (М). 19-00 — «Цыган». Мастацкі фільм. 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-00 — «Пілоты ў піжамах». Прэм'ера тэлевізійнага дакументальнага фільма (ГДР). Чацвёртая серыя (М). 22-10 — «Клуб аматараў песні» (М). 23-00— майстры мастацтваў. Народны артыст СССР Н. Сіманаў (М). 24-00— тэлевізійныя навіны (М).

Другая праграма. 12-45 — «Пунсовая кветачка». Мультыплікацыйны фільм (М). 13-40 — у эфіры — «Маладосць». Перадача з Волгаграда. 19-00 — праграма тэлевізійнай студыі з горада Камсамольска-на-Амуры (М). 20-00 — «Спявае Мікалай Кандрацюк» (М).

1 верасня

Першая праграма. 9-00 — «На зарадку станавіся!» (М). 9-15 —тэлевізійныя навіны (М). 9-30 — «Будзільнік» (М). 10-00 — «Для вас, жанчыны» (М). 10-30 — «Альбом прыроды» (М). 11-00 — для дзяцей. «Я ў школу іду». 11-40 — «Сто забаў на сушы і на вадзе». Тэлевізійны фільм. 12-20 — насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Творы беларускай савецкай літаратуры на кінаэкране. Перадача другая. 13-40 — тэлевізійная энцыклапедычная бібліятэка. Выдавецтвы СССР да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна (М). 14-00 — «Сёння — Усесаюзны дзень работнікаў нафтавай і газавай прамысловасці». Тэлевізійны каляндар. (Уключэнне Мінска) (М). 14-30 — «Па вашых просьбах». Канцэрт. 15-00 — «Музычны кіёск» (М). 15-30 — у эфіры — «Маладосць». «Вечны агонь» (М). 16-30 — праграма каляровага тэлебачання. «Вясёлкавыя вароты». Канцэрт, прысвечаны пачатку навучальнага года (М). 18-00—«Навіны дня». Кіначасопіс (М). 18-15 — «Сем дзён». Міжнародная праграма (М). 19-00 — першынство СССР па футболе. «Дынама» (Кіеў)—«Нафтчы» (Баку). Перадача з Кіева. У перапынку — «Тыдзень блакітнага экрана» (М). 20-45 — заключны канцэрт удзельнікаў Усесаюзнага фестывалю эстраднага мастацтва (II аддзяленне). 22-05 — «Слова мае пракурор». Мастацкі фільм. 23-15 — тэлевізійныя навіны (М).

Другая праграма. 11-00 — для юнацтва. «Лукамор'е». Літаратурны альманах (М). 12-00 — тэлевізійнае агенцтва «Піянерыя» (М). 12-30 — «Першакласніца». Мастацкі фільм (М). 13-40 — дзіцячы экран. «Паркалёвая вуліца». Мультыплікацыйны фільм. «Вясёлыя капітаны». Фільм-канцэрт. 14-30 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Салдаты Поўначы». Перадача з Петразаводска. 19-30 — заключны канцэрт удзельнікаў Усесаюзнага фестывалю эстраднага мастацтва (I аддзяленне). 20-45 — аперэта І. Дунаеўскага «Залатая даліна» (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі—3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда». Індэкс 63856. АТ 01906